Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і Савнаркома БССР

XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ штодзённая ГАЗЭТА

АЎТОРАК 1 ЛІСТАПАДА 1932 г. № 242 (3621)

ТЭЛЕФОНЫ: Адказн. рэдактара 7-69, Аднавн. сакратара 4-78, Аддзелаў . . 6-15, Начальн. рэдакцыі 2-83 (два званка), Выдавецтва . . 2-44

УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 месяц . . . 1 руб., 3 „ . . . 3 „, 6 „ . . . 6 „. Падпіска прымаецца выключна на пошце і лістаносцамі. Рукапісы не зьвяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ 1 радок нонпарэлі 1 руб. КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ 1 дакументу аб згубе 2 руб.

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ—ПЕРАДАВЫ: Канфэрэнцыя германскіх бальшавікоў.

Г. ЛЕБЕДЗЕЎ: Заваёвы лёгкай прамысловасьці СССР за 15 год (3-я стар.)

С. Я. ВАЛЬФСОН: Нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР да XV гадавіны Кастрычніка (2-я стар.).

Б. БРАДОЦКІ: «Бальшавік» працуе над сваёй пяцігодкай (4-я стар.).

УСЕБАКОВА ВЫВУЧЫЦЬ ПРАКТЫКУ МЕНСКАГА КІРМАШУ (1-я стар.).

Бесьперапынна грузіць эшалёны, у бліжэйшыя дні закончыць адгрузку бульбы пралетарам гораду Леніна (1-я стар.).

Арганізавана сустрэць чырвоныя абозы са збожжам, прысьвечаныя Кастрычніцкім сьвятам (1-я стар.).

Разгорнутая падрыхтоўка вырашае посьпех конкурсу (2-я стар.).

50 проц. фінпляну IV кварталу да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі (2-я стар.).

У Бягомлі ігнаруюць будаўніцтва нацменаўскай школы (3-я стар.).

Па баявому рэалізаваць рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б)—выканаць пляны па вырабу шырпажыву (3-я стар.)

ЗА ГРАНІЦАЙ 4-я стар.).

Канфэрэнцыя германскіх бальшавікоў

Германія ўступіла ў палясу новага абвастрэньня клясавай барацьбы. Чым больш робіць спробы фашысцкі ўрад каб перамагчы супярэчнасьці Германскага капіталізму, тым больш яны нарастаюць і абвастраюцца. Расьце масавая стачачная барацьба германскіх рабочых супроць надзвычайнага дэкрэту. Узмацняецца роля кампартыі і рэвалюцыйнага профруху, пад кіраўніцтвам якіх прайшла большасьць забастовак апошняга месяца. Ня гледзячы на вялізарнае беспрацоўе, насупераки ўсім паражэньням «тэорыям» сацыял-дэмократыі, працікстаў, брандлерыянцаў аб немагчымасьці пасьпяховай эканамічнай барацьбы ва ўмовах крызісу, павялічваецца колькасьць забастовак, якія заканчваюцца перамогай рабочых.

Буржуазны лягер, ад фашысцкага ўраду Папена да нацыянал-сацыялістаў і сацыял-фашыстаў уключна, адчувае страх перад новым уздымам рэвалюцыйнай хвалі.

Адсюль спробы манэўраваньня ўраду—абяцаньне пазычыць сацыяльныя дапамогі на 70.000.000 марак на зімовы пэрыяд. З баязьні страціць ідучыя за імі дробна-буржуазныя масы. Нацыянал - сацыялісты разыгрываюць роль «апазыцыі» ўраду Папена. Сацыял-фашысты і правадыры рэфармісцкіх прафсаюзаў рознымі манэўрамі і дэмагогіяй стараюцца сарваць стачачную барацьбу рабочых.

У гэтых абставінах адказнасьць камуністычнага авангарду рабочай клясы асабліва вялізарная. Скончыўшаяся першая канфэрэнцыя камуністычнай партыі Германіі зьяўляецца сур'ёзным этапам у барацьбе за заваёву большасьці рабочае клясы Германіі на бок камунізма.

Германія зьяўляецца найважнейшым вузлом рэвалюцыйнай барацьбы рабочае клясы супроць дыктатуры буржуазіі. З усіх буйнейшых капіталістычных краін яна найбольш блізка да пралетарскай рэвалюцыі. На гэтаму канфэрэнцыя кампартыі Германіі мае асабліва вялікае міжнароднае значэньне.

Канфэрэнцыя КПГ дала марксыцка-ленінскі аналіз новай расстаноўкі клясавых сіл краіны. Германія была і застаецца «зіяючай раной на целе Эўропы». Палітыка буржуазіі заключаецца ў тым, каб крыкамі аб Версальскай сыстэме адцягнуць рабочыя масы ад клясавай барацьбы ўнутры краіны. У гэтай мэце буржуазіі аснаваў палітычнага ашуканства ад нацыянал-сацыялістаў да ўраду ад удзелу ў Жэнэўскай канфэрэнцыі чатырох дзяржаў, як і ўсе патрабаваньні ў галіне раўнапраўя ва ўзбраеньнях, павінна ставіць у масах дробнай буржуазіі ілюзыі.

Канфэрэнцыя правідлова паставіла ў якасьці адной з важнейшых задач кампартыі паказаць шырачайшым масам рабочых і дробнай буржуазіі Германіі, што германская буржуазія гатова на кампроміс з францускім імпэрыялізмам, і што версальская сыстэма можа быць ліквідавана толькі ў барацьбе рабочай клясы за сваё сацыяльнае вызваленьне.

Узмацненьне масава-рэвалюцыйнай барацьбы супроць фашызму—у сучасны момант галоўная задача камуністычнага авангарду. Іменна пагэтаму правільная пастаноўка пытаньня аб характару ўраду Папена, як формы фашысцкай дыктатуры, выпраўленьне ряду грубых апартуністычных памылак у адэнцы фашызму, узаемадносін фашызму, і сацыял-фашызму, ва ўжываньні лёзунга народнай рэвалюцыі,—памылак зробленых тав. Нэйманам і яго групай,—маюць вялізарнае значэньне для ідэялёгічнага і палітычнага ўмацаваньня КПГ.

Спрэчкі, якія ідуць зараз у лягеры германскай буржуазіі,—гэта спрэчкі аб сродках узмацненьня дыктатуры буржуазіі. Унутраныя працэсы ў лягеры буржуазіі, якія адбываюцца на сучасным этапе фашызацыі Германіі, знаходзяць сваё выяўленьне ў новай перагрупіроўцы палітычных партый. Фашысцкая дыктатура ня зьнікне адтак матычна. Далейшыя этапы фашызацыі Германіі знаходзяцца ў непасрэднай залежнасьці ад канкрэтных умоў клясавай барацьбы ў краіне. Сацыял-дэмакратыя расшыпчае шлях да далейшай фашызацыі Германіі ў інтарэсах капіталістычнага выхаду з крызісу іменна тым, што яна адмаўляе наяўнасьць фашысцкай дыктатуры ў Германіі ў асобе сучаснага ўраду Папена з мэтай апраўданьня сваёй пяўснай палітыкі «меншага зла».

Выходзячы з канкрэтных умоў клясавай барацьбы ў краіне партканфэрэнцыя паставіла ў якасьці цэнтральнай задачы бліжэйшага перыяду, барацьбу з усімі формамі фашысцкага прынчнаньня і ашуканства працоўных мас. Нацыяналізм, які становіць з сабою самы моцны масавы рух фашызму, зьяўляецца толькі часткаю фашысцкага фронту. Фашысцкая дыктатура ня ёсьць толькі прыход да ўлады Гітлера, як гэта балбацець сацыял-дэмакраты.

Выкрыцьцё фашызму набывае асаблівае значэньне ў барацьбе за масы і ў барацьбе супроць сацыял-дэмакратыі. Тав. Тэльман у сваім палітычным дакладзе на канфэрэнцыі падкрэсьліў, што важнейшае значэньне мае наколькі шпарка і глыбока ўдасца камуністам ўкараніць ў сьвядомасьць мас учуваньне аб сапраўднай ролі сацыял-фашызму ў далейшым разьвіцьці фашызму.

Паводзіны германскай сацыял-дэмакратыі (у часе фашысцкага перавароту ў Прусіі), ліст Лебэ да Гіндэнбургу, пячуваны цынізм прускіх сацыял-дэмакратычных міністраў, якія хваліліся перад вярхоўным судом у Лейпцыгу сваімі крывавымі ўчынкамі супроць германскага пралетарыяту, на практыцы паказвае шырачайшым масам працоўных ролю сацыял-дэмакратыі, як галоўнай сацыяльнай апоры буржуазіі пры фашысцкай дыктатуры.

Перад тварам магутнай цягі рабочых і ў тым ліку сацыял-дэмакратычных рабочых,—да адзінага рэвалюцыйнага фронту, перад тварам посьпехаў антыфашысцкага адзінага фронту зьнізу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, сацыял-дэмакратыя ўжывае ўсё больш шырокія дэмагагічныя манэўры, адольныя ашукаць, пры адсутнічаньні своечасовага выкрыцьця з боку камуністаў, значныя масы рабочых і затрымаць працэс нарастаньня крызісу сацыял-дэмакратыі.

Партыйная канфэрэнцыя КПГ — у поўнай адпаведнасьці з пастановамі 12-га пленуму Выканкому Камінтэрну — рашуча ўдарыла супроць галоўнай, правай небясьпекі, якая выяўляецца перш за ўсё ў «даверлівых» адносінах да манэўраў сацыял-дэмакратыі, супроць правых опроб падмены адзінага фронту з сацыял-дэмакратычнымі рабочымі, блёкам з сацыял-дэмакратычнымі правадырамі. Разам з тым партыйная канфэрэнцыя рэзка асудзіла тэорыю ўтоемсамляючую сацыял-дэмакратыю і фашызм, якая ня бачыць розьніцы паміж фашызмам і сацыял-фашызмам,—розьніцы існуючых пры наяўнасьці буржуазнай сутнасьці гэтых абедзьвёх партый.

Канфэрэнцыя асудзіла ўсякае ігнараваньне задач заваёвы сацыял-дэмакратычных рабочых і ўсякае звужваньне адзінага фронту пралетарыяту, напрыклад падмену лёзунгу адзінага пралетарскага фронту лёзунгам «чырвонага рабочага фронту».

Вялізарныя задачы заваяваньня большасьці пралетарыяту, якія стаяць перад кампартыяй Германіі, дыктуюць ёй неабходнасьць палепшаньня ўсёй масавай работы, палепшаньня ўсіх форм агітацыі і прапаганды. Канфэрэнцыя асабліва падкрэсьліла неабходнасьць пранізаць усю штодзённую агітацыю і прапаганду лёзунгам дыктатуры пралетарыяту.

Адначасова канфэрэнцыя ўказала на тое, што неабходна намагчы ўсе сілы для таго каб перамагчы значнае адставаньне КПГ у штодзённай масавай працы на прадпрыемствах і сярод беспрацоўных. Канфэрэнцыя асудзіла недацэнку прафсаюзнай працы, паслабленьне работы ўнутры рэфармісцкіх прафсаюзаў і лёзунгі, якія вядуць да гэтага паслабленьня, як напрыклад «руйнуйце АДГД» (Усеагульнае аб'яднаньне германскіх прафсаюзаў), «Спыніце ўзносы ў рэфармісцкія прафсаюзы».

Канфэрэнцыя КПГ правідлова правяла жорсткую самакрытыку ў сувязі з памылкамі, дапушчанымі партыяй, якая ня сумела мабілізаваць масы ў часе фашысцкага перавароту ў Прусіі. Канфэрэнцыя КПГ асудзіла, нарэшце, групавую работу т. Нэймана.

Перад тварам нарастаючага рэвалюцыйнага ўздыму, рэвалюцыйная інициятыва, гібкая бальшавіцкая тактыка, жалезнае адзінства і дысцыпліна ў радах камуністычнага авангарду—важнейшы залог пасьпяховага давядзеньня шырокіх працоўных мас у самыя кароткія гістарычныя тэрміны да вялікіх рэвалюцыйных баёў і перамог.

(Скарочаны перадавы арт. «Правды»)

Рапартуем аб перамозе

Гаркому партыі — тав. Гікало, Шпэктараву, гарсавету—Валодзько, Белкапсаюзу—Хаскіну, рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» і Цэнтральнаму штабу па ўсесаюзным конкурсе

Астрашыцка-Гарадзецкае селсавет СТ Менскага райспажыўсаюзу пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, на аснове шырока разгорнутай работы і мабілізацыі працоўнага сялянства-пайшчыкаў вакол выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў,—дамагаюся перамогі на фінансавым фронце. На 28 кастрычніка г. г. плян IУ кварталу па паёх выкананы на 101 проц., задавы плян—на 106,5 проц. Змагаемся за далейшае 100-процантнае каапераваньне ўсяго працоўнага сялянства.

Сакратар парткалектыву *Жаўрыт.*

Старшыня праўленьня сельСТ *Драздовіч.*

Старшыня мясцкому сельСТ *Шырэй.*

Дамо 50 проц. квартальнага фінпляну да кастрычніцкіх сьвят

Рагачэўскі раённы зьлёт ударнікаў фінфронту ў колькасьці 200 асоб, сабраўшыся для абмеркаваньня вынікаў выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў III кварталу і задач IУ кварталу, завярае партыю і ўрад, што ўдарных тэмпаў і надалей не паслабяць, што яны пераключаюцца на якаснае выкананьне пляну і абяцаюць пад бальшавіцкім кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, плян IУ кварталу выканаць поўнасьцю да 15 сьнежня і на 50 проц. да XУ гадавіны Кастрычніка.

Прэзыдыум зьлёту

УСЕБАКОВА ВЫВУЧЫЦЬ ПРАКТЫКУ МЕНСКАГА КІРМАШУ

Улічыць урокі Менску пры арганізацыі кірмаршоў ў іншых гарадох

Два дні Менскага кірмашу

Першыя два дні Менскага міжраённага кірмашу могуць быць запісаны ў актыў каапэрацыі, дэярыгандлю і прамкаапэрацыі. Калгасьнікі і аднаасобнікі, якія прыехалі на кірмаш, зьдзіўлёны вялікай колькасьцю тавараў шырпажыву. Ларкі запоўнены рознымі таварамі. На кірмашы можна знайсьці ўсё, што неабходна вёсцы для спажывецкіх і гаспадарчых патрэб, пачынаючы з пашчох і бацінак і канчаючы коламі і хамутамі.

Багаты асартымэнт дала саматужная прамысловая каапэрацыя. Вялікім посьпехам карыстаецца выпушчаны ёю тапны рабочы абутак на драўлянай падэшве.

Значная колькасьць тавараў шырпажыву і добры асартымэнт сьведчаць у асноўным аб здавальняючай падрыхтоўцы гандлёвых арганізацый да кірмашу, аб пэўным зруху ў іх рабоце па абслугоўваньні сялянскага спажыўца. Запоўненыя таварамі палцы кірмашовых ларкоў, разам з тым зьявіліся навочнай дэманстрацыяй нашых вялікіх магчымасьцяй і бясспрэчных посьпехаў ужо дасягнутых у галіне вырабу прадметаў шырпатрэбы. Міма гэтага вялізарнага значэньня палітычнага факту ня мог прайсьці ні адзін удзельнік кірмашу.

Аднак, падвоз сельска-гаспадарчых прадуктаў яўна не адпавядае прамтаварнай сустрэчы. Кірмаш—міжраённы, але ўдзел у ім прымаюць амаль выключна прыгарадныя менскія калгасы, калгасьнікі і аднаасобнікі. Раёны-ж, якія мяжуюць з Менскім, [illegible] слабымі калгасамі.

— Сёньня-ж толькі першы дзень, да рогі-ж размуты, дожджык ідзе,—думаюць кірмашовы камэнт недапушчаць на слабы ўдзел прыгарадных раёнаў у кірмашы.

У пэўнай меры гэта правільна, але ў асноўным справа ня ў гэтым. Раёны, якія абавязаны былі прымаць удзел у кірмашы, да яго не падрыхтаваліся, або падрыхтаваліся горэна. Больш-шасьць раённых арганізацый недаацаніла палітычнага значэньня кірмашу, абмежавалася пасылкай абежнікаў і паведамленьняў у калгасы і вёскі, а масавай работы не праводзіла.

Тыя калгасы, якія ўдзельнічаюць у кірмашы, выкінулі вялікія партыі прадуктаў. Шмат мяса, малака, гародніны, птушкі. Гэта факт наяўнасьці ў прыгарадных калгасах вялікіх таварных лішкаў; адсутнасьць-жа на кірмашы калгасаў з акаляючых Менск раёнаў—яскравы паказьнік няўменьня мясцовых арганізацый арганізаваць калгасны гандаль, недаацэнкі яго ролі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў.

Ня гледзячы на непадвоз сельска-гаспадарчых прадуктаў з аддаленых калгасаў і вёсак, цэны наогул значна зьнізіліся. Калі ў першы дзень ранідою кілё мяса каштавала 12 руб., бульбы—80 кап., а літар малака 2 р. 50 к., дык пасьля поўдню оклаліся такія сярэднія цэны: кілё мяса—6-7 руб., бульбы—40 кап., літар малака—1 руб. 25 к.

Цэны зьбіла група калгасаў, якая разьмясьцілася на правым баку кірмашу. Тут мэнна гандаль ішоў найбольш бойка. Левы-ж бок кірмашу доўга прытрымліваўся высокіх цэн, ня ведаючы аб становішчы рэчаў на правым баку.

Адсутнасьць інфармацыі прадаўца і спажыўца аб оклаўшыхся на кірмашы цэнах аказала вялікі тармозячы ўплыў на зьніжэньне цэн. Гэтая справа ня была арганізавана на кірмашы. Больш за ўсіх у гэтай галіне магло зрабіць радыё вяшчаньне, але яно не зрабіла літаральна нічога. Кірмаш не радыёфікаваны. На ўсю тэрыторыю кірмашу прыпадае толькі некалькі рэпрадуктараў, якія перадаюць... музыку прамовы з цэнтральнай студыі. Непамерна большую палітычную карысьць прынесла-б радыёвяшчаньне, калі-б яно замест трансляцыі музыкі паведамляла аб зьніжэньні тым ці іншым калгасам або аднаасобнікам цэн на сельска-гаспадарчыя прадукты.

Недахопы, якія выявіліся на працягу першых двух дзён Менскага кірмашу, трэба ўлічыць у далейшым. Асаблива гэта датычыць тых гарадоў і раёнаў, якія арганізуюць калгасныя кірмашы ў бліжэйшы час.

В. Е.

На міжраённым кірмашу калгас «Вольная праца» прадае малако.

Будзёныя і выдатныя дні

30 і 31 кастрычніка з самай раніцы з усіх вуліц, з розных канцоў гораду на Тройцкі базар цягнуліся падводы. Абганяючы адзін аднаго, ішлі рабочыя і служачыя менскіх прадпрыемстваў і ўстаноў. Нават тады, калі яшчэ было цёмна, базарная плошча была ўжо напоўнена прыехаўшымі калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі.

У рад расстаўлены вазы, на якіх акуратна пакладзены прадукты сельска-гаспадарчай вытворчасьці: мяса і яйкі, грыбы і сыравіны, плодагародніна і інш.

Прыехаў на кірмаш і калгасьнік АНДРЭЙ ЛЕВЯНЬКОЎ з бліжэйшага прыгараднага калгасу. Ён прывёз л'ш кі сваёй прадукцыі—малако і курэй. У гэтым годзе ён на шмат больш, чым ся ў мінулым, атрымаў збожжа за выпрацаваныя ў калгасе дні і мяркуе выкінуць лішкі збожжа на базар пасьля таго, калі прыдзе ўрадавы тэрмін гандлю збожжам калгасамі, калгасьнікамі і працоўнымі аднаасобнікамі.

Андрэй Леванькоў прыехаў яшчэ ўчора і пераначаваў у аўсным доме на Камунальнай вуліцы. Яго там прыхільна сустрэлі і ён, задаволены чулымі адносінамі да сябе, гаварыў:

— Вось зараз ня то што раней. Прыехаў на базар, а тут табе і пераначаваць і зьесьці ёсьць шт... Відаць што людзі пра нас клапоцяць.

Зараз ён стаіць вось на базарнай плошчы, прадаўшы прывезеныя прадукты. За атрыманыя грошы ён купіў пасуды, дзяўчыне добрае паліто ў ларку Белсампрамкаапэрацыі.

Леванькоў, як і ўсе добрасумленныя прадаўцы, змагаецца супроць спэкулянтаў і перакупшчыкаў. Ён расказвае выпадак, калі перакупшчык, накупіўшы ў яго малако па 2 руб., тут-жа прадаваў па 2 руб. 50 к. І Леванькоў ня вытрымаў, як-жа гэта можна дапусьціць, каб спэкулянты нажываліся на яго прадуктах, на калгасным гандлі. І Леванькоў паведаміў аб перакупшчыку прадстаўніку рабочага кантролю.

Калгасьнік Леванькоў зусім па праву і зусім слушна абураецца яшчэ і другім зьявішчам:

— Вось мне яшчэ невядома яшчэ шмат чаго—куды ідуць сродкі ад продажу прадукцыі калгасамі. Шмат чаго ня ведаю я аб цэнах. Хацелася-б запытацца, але няма ў каго. Чаму-б не зрабіць так, каб да вазоў прыйшлі людзі, якія могуць растлумачыць тое, чаго я ня ведаю.

І сапраўды Леванькоў мае рацыю. Чаму калгасны базар ня можа быць трыбунай для папулярызацыі рашэньняў партыі і ўраду аб калгасным гандлі, аб уздымі ўраджайнасьці, для растлумачэньня раду іншых пытаньняў? Чаму на калгасным базары яшчэ няма агітатараў? Калгасьнік Леванькоў зусім праў і яго прапанову трэба падтрымаць, зараз-жа ажыцьцявіць на справе.

Пад вечар калгасьнік Леванькоў паехаў дамоў задаволены калгасным кірмашом, з закупленымі таварамі і пасудай.

— А заўтра,—усьміхаўся і абяцаў Леванькоў,—прыеду ў другі раз. Абавязкова прыеду і прывязу малако, ёсьць яшчэ і іншыя тамія-сякія прадукты. Суседа таксама пацягну.

На базарную плошчу сьцякаюцца новыя патокі людзей, пад'яжджаюць новыя падводы. На вазох яшчэ болей зьяўляецца прадуктаў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, масла і малако, мяса і гародніна, садавіна і прысы, бульба і куры, яйкі і шмат інш. Ларкі вывешваюць новую вопратку, хусткі і паліто, новы абутак, шмат іншых прадметаў шырокага спажываньня.

Гандаль у разгары...

Вяч. П.

Гадавы плян збожжазагатовак— да XУ гадавіны Кастрычніка

АРГАНІЗАВАНА СУСТРЭЦЬ ЧЫРВОНЫЯ АБОЗЫ

са збожжам, прысьвечаныя кастрычніцкім сьвятам

У час кастрычніцкіх сьвят арганізаваць бесьперабойную работу загатпунктаў

У час сьвяткаваньня XУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі у БССР разгорнецца масавая здача збожжа і іншай прадукцыі. Калгасьнікі і працоўныя аднаасобнікі арганізуюць чырвоныя абозы са збожжам.

Выходзячы з гэтага «Белзагатэрнё» мабілізуе ўсе свае сілы на бесьперабойную прыёмку ўсіх відаў загатовак. Зараз праводзіцца шырокая масавая работа, каб у дні сьвяткаваньня калгасы, саўгасы і бядняцка - сярэдняцкае селянства наладзілі чырвоныя абозы па здачы рэштак запазычанасьці па збожжазагатоўках.

«Белзагатэрэ» сумесна з ЦСПСБ прапанавана ўсім райканторам «Загатэрне» наладзіць бесьперабойную работу на загатоўчых пунктах і элеватарах, а таксама арганізаваць як сьлед адгрузку і выгрузку збожжа. На гэтыя дні ўстанаўляюцца дзяжурствы адказных работнікаў.

Рудзін.

Лепшы падарунак Кастрычніку

ЧЭРВЕНЬ. Калгас *«Чырвоны штандар»* (Лядзенскі сельсавет) па-бальшавіцку сустракае XУ гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. Калгас выканаў плян збожжазагатовак на 100 проц. Таксама цалкам выкананы пляны бульба-і мясазагатовак. Калгас своечасова окончыў уборку бульбы і перавор ваньне бульбянішча. Поўнасьцю праведзены абмалот усіх культур.

Зараз калгас *«Чырвоны штандар»* па-ударнаму завяршае зяблівае ворыва. Арганізаваны брыгады для апрацоўкі лёну. У час сьвята калгас абавязаўся цалкам выканаць плян па здачы (продажы) лёнавалакна дзяржаве.

Я. Ермаловіч.

Ня дапусьціць зьніжэньня тэмпаў

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.). На 25 кастрычніка плян збожжазагатовак у раёне выкананы на 63,7 проц. Ударныя тэмпы работы, узятыя ў пачатку на фронце збожжазагатовак, у апошні час значна паслаблі.

Перадавыя сельсаветы, якія некалькі пяцідзёнак таму назад дамагліся пэўнага пералому ў галіне збожжазагатовак, зараз здалі тэмпы і значна недавыконваюць пляны. Так, СМАЛЯВІЦКІ сельсавет за апошнюю пяцідзёнку мае прырост на 0,1 проц., Амаль янаўскі сельсавет дасягнуў толькі 0,8 проц. павялічэньня. Таксама маюць нязначнае павялічэньне і рад іншых сельсаветаў раёну.

Як і раней, не разгарнуўся як сьлед спагнаньне цьвёрдых заданьняў з кулацка - заможных гаспадарак, ня гледзячы на шмат дырэктыў партыйных і савецкіх арганізацый. На 25 кастрычніка плян па цьвёрдых заданьнях выкананы толькі на 24,6 проц.

Падрыхтоўку і правядзеньне сьвяткаваньня Кастрычніцкіх сьвят трэба адзначыць арганізацый, масавых чырвоных абозаў са збожжам. У гэтыя дні Смалявіцкі раён павінен цалкам ліквідаваць сваю запазычанасьць па здачы (продажу) збожжа дзяржаве.

П. КАВАЛЁЎ.

Перадавікі збожжазагатовак

▲ Калгасны сэктар КЛІМАЎШЧЫНЫ перавыканаў плян збожжазагатовак—здана дзяржаве 326.554 цнтр., або 102 проц. заданьня.

▲ Калгас «НОВЫ СЬВЕТ» плян выканаў на 175 проц.; «12 КАСТРЫЧНІК» (Забялышанскі сельсавет)—на 169,0 проц.; калгас «СЬВЕТ» (таго-ж сельсавету)—на 152,7 проц.; «САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ЎДАРНІК» (ДАМАМЕРЫЦКІ сельсавет)—на 150 проц., калгас імя БЛЮХЭРА—на 130 проц.



На заканчэньне важаць зданае збожжа.

БУльба—Ленінграду

БЕСЬПЕРАПЫННА ГРУЗІЦЬ ЭШАЛЕНЫ

У бліжэйшыя дні закончыць адгрузку бульбы пралетарскаму гораду Леніна

Бульбу адгружаць круглыя суткі

Партыя дала баявую задачу нашай рэспубліцы — адгрузіць пралетарам Ленінграду 191 тыс. тон бульбы. Тэрмін выкананьня—1 лістапада.

Першыя дні і амаль увесь час адгрузкі паказалі, што ў гэтай справе адразу ня было ўзята бальшавіцкіх тэмпаў. Замест таго каб штодзённа грузіць Ленінграду 7.500 тон бульбы, адгружалася 2,5—4 тыс. тон.

У выніку гэтага на 31 кастрычніка плян адгрузкі бульбы Ленінграду выкананы ўсяго на 58,1 проц. Ліквідацыя ганебная.

Невыкананьне ў тэрмін пляну адгрузкі тлумачыцца толькі тым, што арганізацыі на месцах не ўставілі штодзённага аперацыйнага кіраўніцтва ходам адгрузкі, ня была наладжана кругласутачная адгрузка.

Дрэнна адбілася на ходзе адгрузкі адсутнасьць добрага рабочага і грамадзкага кантролю. Факты непадачы ў свой час вагонаў, грузу, несвоечасовая нагрузка і г. д. так і заставаліся фактамі. Канкрэтныя вінаватыя ў тых ці іншых агідных дзеяньнях ня былі сурова пакараны. Гэта безадказнасьць у сваю чаргу прывяла да абязьлічкі, ня ведаеш хто-ж будзе адказваць за недагружаныя вагоны. Такія зьявішчы прынялі шырокі размах. У апошнія дні мы маем факты, калі ад. Камунары было недагружана 4 вагоны, з-за таго, што бульба была гнілая.

Яшчэ больш агідны факт—29 кастрычніка, з-за несвоечасовага падвозу бульбы да чыгункі, 58 вагонаў заставаўся не нагружанымі. Вінаватыя ў гэтых злачынных дзеяньнях павінны панесьці суровую кару. Мы патрабуем неадкладнай здачы іх пад суд. Ні ў якім разе нельга дапусьціць таго каб з-за несвоечасовай падачы грузу тармазілася адгрузка бульбы Ленінграду.

Тэрмін адгрузкі сарваны. Нам зараз-жа з усёй сілай, з бальшавіцкай упартасьцю, трэба ў бліжэйшыя дні дабіцца поўнага выкананьня адгрузкі бульбы.

Трэба неадкладна ўзяць курс на кругласутачную адгрузку і падвозку бульбы.

Партыйныя, прафсаюзныя і савецкія арганізацыі на месцах павінны мабілізаваць увесь свой актыў, усю пралетарскую грамадзкасьць на заканчэньне адгрузкі ў бліжэйшыя дні.

191 тыс. тон пралетары гор. Леніна павінны атрымаць цалкам.

Адгружана бульбы Ленінграду

(у тысячах тон і проц.)

	На 29 кастрычніка	На 30 кастрычніка	На 31 кастрычніка
Белкаапплодагароднін.	72,6 т.—58 пр.	76,6 т.—61,3 пр.	79,1 т.—63,3 пр.
Белплодагароднін.	29,2 т.—44,9 пр	30,8 т.—46,6 пр.	31,8 т.—48,1 пр.
Усяго па БССР	101,8 т.—54 пр.	107,4 т - 56,3пр.	110,9 т.--58,1 пр

З дню на дзень нарастаюць тэмпы

ВІЦЕБСК. Тэмпы адгрузкі бульбы Ленінграду, дзякуючы разгорнутай масава-аперацыйнай рабоце ў апошнія дні значна ўзмацніліся. Калі на 26 кастрычніка было адгружана 58 тон бульбы, дык на 28 кастрычніка адгружана ўжо 190 тон, а на 29—182 тоны.

Агульны плян адгрузкі на раёне выкананы на 29 кастрычніка на 58,5 пр.

Перадавымі сельсаветамі зьяўляюцца Замастоцкі, які выканаў плян адгрузкі на 97 проц., Міхалеўскі—на 96 і Машканскі—на 82,1 проц. (БелТА).

Пагружана бульбы Ленінграду па чыгунках БССР на 30 кастрычніка

Назва раёну пагрузкі	Колькасьць вагонаў: Запатрабавана	Падана	Пагружана	Недагружана па віне: чыгункі	кліентуры
Віцебскі	73	72	63	1	9
Аршанскі	61	56	46	5	10
Унецкі	50	50	38	—	12
Жлобінскі	142	142	119	—	23
Гомельскі	55	55	51	—	4
Карасьценьскі	8	8	8	—	—
Усяго па БССР	389	383	325	6	20

Дум ачэньне недагрузу: чыгункай — непадача аднаго вагону на перагон, непадача 5 вагонаў у Койданаве.

Кліентурай—з-за непадвозу грузу да станцыі: Быхаў, Бурбін, Камунары, Баркавічы, Шклоў, Ворша, Коханава, Бобр, Крупкі, Лёзна, Хойнікі, Рэчыца, Якімавічы, Рэста і Пад'езд 162 клм.

Недахоп рабочай сілы (Бярэзіна), марудная пагрузка (Сяло) і з прычыны нагоднай бульбы (Камунары).

Перадавікі выконваюць пляны адгрузкі

ЖЫТКАВІЧЫ. Рад перадавых калгасаў Жыткавіцкага раёну цалкам выканалі пляны адгрузкі бульбы Ленінграду.

Усе калгасы Руднянскага сельсавету—калгас «Бярэзіна», «Камуна», «1-ае мая», імя Дзяржынскага, «Доўгас», «Града», «Сукачы» і «Нова-Ленінка» цалкам выканалі і перавыканалі пляны загатовак бульбы.

Калгас «III Інтэрнацыянал» у якога ёсьць СТФ і якому ня даны плян загатоўкі бульбы, шляхам самаабавязацельства здаў 10 тон бульбы. Таксама ў парадку самаабавязацельства здаў тры тоны бульбы калгас імя Калініна.

Жыткавіцкі местачковы савет свой плян адгрузкі бульбы Ленінграду выканаў на 124,3 проц.

ЮРКА БАСЬКО.

ПРАВЯРАЕМ РЭАЛІЗАЦЫЮ САКАВІКОУСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК І ЦКК КП(б)Б

У Бягомлі ігнаруюць будаўніцтва нацменаўскай школы

Рабочыя прадпрыемстваў БССР, адказвайце на заклік фабрыкі „Камунарка“

У Барысаве паслаблена барацьба з шавінізмам

Барысаўскі раён, як і ўся Савецкая Беларусь, дамогся вялізарнейшых посьпехаў на фронце нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Досыць зазначыць на тое, што ў раёне ёсьць 109 беларускіх школ, 5 польскіх, 3 яўрэйскіх, 1 латыская, 1 літоўская і 1 руская сямігодка, некалькі ФЗУ, тэхнікумаў. Амаль цалкам ліквідавана няпісьменнасьць, вядзецца работа па ліквідацыі малапісьменнасьці. Арганізаваны нацыянальны польскі сельсавет—Лозінскі.

Але побач з дасягненьнямі ў паасобных участках нацыянальна-культурнага будаўніцтва ёсьць прарывы. Моск на падаць шмат фактаў ігнараваньня беларускай мовы. У райкалгасасюзе, «Заготзерне», работнікі, добра ведаючы беларускую мову, вядуць гутарку на рускай мове. На такіх прадпрыемствах, як «Бярэзіна», «Камінтэрн», «Прафінтэрн» таксама маюць месца выпадкі ігнараваньня беларускай мовы.

На гуце імя Домбаля налічваецца каля 30 проц. рабочых-палякаў. Сакратар ячэйкі КП(б)Б і старшыня заўкому добра ведаючы польскую мову, чамусьці з гэтымі рабочымі па-польску не гавораць.

Трэба проста сказаць, што справа аб слугоўваньня нацыянальных меншасьцяй па радзе месц пастаўлена нездавальняюча. У Лэ'нскім нацыянальным сельсавеце дадумаліся да таго, што рахункаводзіца вядуць не на польскай, а на беларускай мове.

Не аддаюць дастаковай увагі пытаньням нацыянальна-культурнага будаўніцтва і некаторыя раённыя арганізацыі. Паасобныя работнікі раённых арганізацыяў, у тым ліку і райвыканкому, добра ведаючы беларускую мову, гавораць з наведвальнікамі на рускай мове.

РК КП(б)Б павінен рашуча ўдарыць па праявах шавінізму ўсіх колераў. Вялікадзяржаўныя шавіністы, якія ігнаруюць беларускую і нацыянальную мову, павінны быць сурова пакараны.

Г. Кугель.

З чым прыходзіць Каладзішчанская ШКМ да ХУ гадавіны

Рапарт рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь“ і Менскаму Гарана

Па-бальшавіцку змагаючыся за ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе і рашэньняў сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, зматалочыся за павышэньне якасьці навучаньня, за стварэньне сапраўднай палітэхнічнай школы, Каладзішчанская ШКМ да сьвяткаваньня Кастрычніцкай рэвалюцыі прыходзіць з наступнымі вынікамі.

Школьныя заняткі былі распачаты ў вызначаны Наркамасьветы тэрмін у новым, поўнасьцю абсталяваным будынку, у якім разьмешчаны 8 груп у адну зьмену.

Працуючы па новых праграмах, ШКМ узяла рашучы напрамак для стварэньня сапраўднай палітэхнічнай школы, увязваючы набыцьцё гэарэтычных ведаў з вытворчай практыкай, для чаго складзены плян правядзеньня палітэхнізацыі.

Каладзішчанская ШКМ дамагалася поўнага выкананьня ўсёй навучальна-выхаваўчай работы ў школе і яе ўліку. У галіне камуністычнага і інтэрнацыянальнага выхаваньня ў школе заснаваны грамадзкія арганізацыі: МОПРу, АЗЭТ, ваяўнічых бязбожнікаў, Асоавіяхім, Аўтадор, «Прэч Ня пісьменнасьць».

Пры ШКМ арганізаваны 2 піянэрскіх атрады, якія яднаюць 116 піянэраў, ёсьць ячэйка камасмолу, в 9 чал., дзьве групы акцябрат у 22 вучні (усяго вучняў у школе 270 чл.). З самага пачатку заняткаў у школе арганізавана вучнёўскае самакіраваньне, якое актыўна ўключылася ў барацьбу за рэалізацыю пастаноў ЦК партыі аб школе.

Шляхам разгортваньня масавай работы з бацькамі школа сабрала 800 руб. у фонд арганізацыі гарачых сьніданьняў, пры дапамозе бацькоў школа цалкам забясьпечана апалам, для арганізацыі гарачых сьніданьняў загатоўлена дастатковая на першыя месяцы колькасьць гародніны і іншых прадуктаў.

Сярод вучняў праведзена падпіска на пазыку «4-ты завяршаючы» і набыты аблігацыі апошняй на суму 300 р.

Для абсталяваньня рабочага пакою закуплены сталярны варштат з поўнымі для чго прыладамі, набыта 2 шэйных машыны для апрацоўкі тэкстылю. Да сьвяткаваньня XV гадавіны Кастрычніка школа закладе фруктовы сад на 20 дрэў, набыла ўлашы кіно-апарат за 900 руб.

Гэтых вынікаў Каладзішчанская ШКМ дамагалася дзякуючы разгортваньню ўдарніцтва сярод настаўнікаў і вучняў і выкананьню ўзятых ударнікамі абавязацельстваў.

Разам з дасягненьнямі мы маем яшчэ рад недахопаў, на ліквідацыю якіх школьны калектыў мабілізаваўся і запаўняе, што з вялікай большай напружкасьцю мы будзем змагацца за рэалізацыю дырэктыў партыі і ўраду ў галіне школьнага будаўніцтва, за павышэньне якасьці вучобы, за ператварэньне школы ў сапраўды палітэхнічную школу Маркса і Леніна.

Загадчык ШКМ Ляхоўскі.
Загадчык навучальнай часткі Кантарэр.
Старшыня сельскому Працасьветы Трус.
Старшыня сельсавету Шырко.

Рабочая грамадзкасьць на дапамогу школе

Фабрыкі і заводы БССР, прымайце выклік

(З адозвы рабочых Менскай фабрыкі „Камунарка“

Перазаключаючы дагавор з Менскай нацыянальнай яўрэйскай 12-й ФЗС на 1932-33 навучальны год, мы падагуль ваем вынікі нашай барацьбы за рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) аб школе і сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб культурным будаўніцтве.

Фабрыка арганізавала экскурсіі пэдагогаў і вучняў на фабрыку, вылучыла інструктара вытворчай практыкі, арганізавала практыку для 6-й і 7-й груп школы. Вучні школы ўсебакова азнаёмлены з фабрыкай, з яе гісторыяй, арганізацыяй і працэсамі работы. Фабрычныя арганізацыі і работчыя непасрэдна азнаёміліся з акадэмічнай работай у школе. Калектыў фабрыкі ўвесну г. г. разам са школай уключыўся ва Усебеларускі конкурс на лепшую школу. Як школа, так і фабрыка прэм'яваны, фабрыка атрымала ганаровую грамату за работу са школай.

«Камунарка» аказала вялікую дапамогу школе і ў культурна-масавай рабоце. Сумесна са школай праведзены рад гаспадарча-палітычных кампаній: рэалізацыя пазыкі, калгасагарная кампанія, перавыбары фабкому, антырэлігійныя кампаніі. Фабрыка прымала актыўны ўдзел ва ўсім грамадзкім жыцьці школы.

Адпушчана 1600 руб. для набыцьця інвэнтару і для абсталяваньня рабочага пакою і майстэрні, фабрыкай аплачваецца інструктар вытворчай практыкі. На рамонт школы, на абсталяваньне габінэту па хіміі адпушчана 1600 руб. і выдана 2 пуцёўкі ў дом адпачынку для настаўнікаў і 3 ударныя кніжкі.

Брыгада рабочых удзельнічала ў праведзеньні пробнага дню вучобы, рабочыя прысутнічалі на пэдагагічных нарадах, дзе стаяла пытаньне аб задачах новага навучальнага году і прапрацоўка пастановы ЦК УсеКП(б) ад 25 жніўня гэтага году. Сярод рабочых гэтая важнейшая пастанова партыі шырока папулярызавана.

Дагавор паміж фабрыкай і школай выкананы на 90 проц. Мы яшчэ ня выкарысталі ўсе магчымасьці, а ў паасобных выпадках недастаткова актыўна дапамагалі школе, ня здолелі ў дастатковай колькасьці выкарыстаць рабочую ініцыятыву.

Умацоўваючы дапамогу школе, мы лічым неабходным прыцягнуць увагу самых шырокіх мас працоўных на рэалізацыю задач, якія ставіць перад сакавіцкай палітэхнічнай школай,—мабілізаваць рабочыя масы на пасьпяховае ажыцьцяўленьне пастановы ЦК УсеКП(б) аб школе і сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб культурным будаўніцтве.

Мы заклікаем усе фабрыкі і заводы Беларусі праверыць выкананьне сваіх абавязацельстваў па дагаворах з пад шэфныя школамі, мабілізаваць усе сілы рабочай грамадзкасьці на дапамогу школе ў яе барацьбе за якасьць вучобы, за жорсткі рэжым, за сьвядомую дысцыпліну за поўнае і пасьпяховае ажыцьцяўленьне пастаноў ЦК УсеКП(б) аб пачатковай і сярэдняй школе і рашэньняў сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б аб культурным будаўніцтве.

Сакратар парткалектыву Капялёвіч.
Старшыня фабкому Фрыдлянд.
Дырэктар фабрыкі Пятрухін.
Культпрацаўнік цэхоў Гіль.

Разбазарваюць нацыянальныя кадры

Кемешаўская польская школа, Бягомльскага раёну, не ўкамплектавана настаўнікамі. Да гэтага часу не распачаты заняткі. Гэтая школа,—адна польская школа на ўвесь раён. Але ніякіх захадаў райана ня прымае, каб укамплектаваць школу настаўнікамі. Больш таго, настаўніца, якая скончыла польскі пэдтэхнікум, прызначана ў беларускую школу. Разбазарваюцца нацыянальныя кадры, што зрывае работу нацыянальных школ.

Неабходна прыняць неадкладныя рашучыя меры па ўкамплектаваньні школы настаўнікамі і хутчэй пачаць заняткі.

Мысліцкі.

Па-баявому рэалізаваць

рашэньні пленуму ЦК УсеКП(б)—выканаць пляны па вырабе шырспажыву

Арганізацыі цэхаў па вырабу шырспажывы—бальшавіцкі размах

Дырэктыва партыі і ўраду аб вырабе тавараў шырокага спажываньня і апошняе рашэньне верасьнёўскага пленуму ЦК УсеКП(б) з усёй настойлівасьцю ставяць пытаньне перад усімі партыйнымі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі аб узмацненьні барацьбы за выраб шырспажыву, а гэта значыць за разгортваньне савецка-каапэратыўнага гандлю, за ўзмацненьне вытворчай змычкі паміж сацыялістычнымі прадпрыемствамі і сацыялістычнай вёскай.

Верасьнёўскі пленум ЦК УсеКП(б) у сваіх пастановах абавязаў усе партыйныя арганізацыі аказваць максымальную дапамогу ў справе разгортваньня вырабу шырспажыву.

Аднак, ня гледзячы на зусім чоткія і выразныя дырэктывы Цэнтральнага камітэту нашай партыі, мы да апошняга часу маем выпадкі, калі паасобныя гаспадарнікі, партыйныя арганізацыі прадпрыемстваў глядзяць на арганізацыю ўтыльцэхаў, цэхаў па вырабе шырспажыву, як на дробязь, якая не заслугоўвае [illegible] ўвагі. Прыкладам гэтага зьяўляецца большая частка прадпрыемстваў гораду Магілёва, дзе выраб тавараў шырокага спажываньня ігнаруецца. Чаго варты такі факт, калі ў цэху па вырабе шырспажыву на мэблевай фабрыцы працуе толькі два рабочых, або адказ кіраўнікоў мэталякамбінату аб тым, што шырспажыва— гэта дробязь, што ім няма часу гэткай справай займацца.

Такія агідненькія адносіны прывялі да таго, што арганізаваныя цэхі па вырабе шырспажыву на паасобных прадпрыемствах не працуюць, развальваюцца, што на паасобных прадпрыемствах вырабляюць шырспажыву ня ўліч ваючы патрэбнага сялянству асартымэнту і г. д. На паасобных прадпрыемствах г. Магілёва мы наглядаем і такія факты, што тавары шырокага спажываньня не адпраўляюцца своячасова для продажу, і на складах ёсьць вялікая колькасьць замарожаных тавараў.

Мы патрабуем ад усіх партыйных арганізацыяў, каб у барацьбу за шырспажыву былі ўключаны дэпутацкія групы прадпрыемстваў. Мы патрабуем, каб ніводнае гадзіны не затрымліваць тавараў шырокага спажываньня на складах фабрык і заводаў, мы патрабуем, каб яны хутка і своячасова выкідваліся на рынкі.

Магілёўскі гарком КП(б)Б павінен ва ніцца высьвятленьнем прычын, чаму ігнаруюцца важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду аб вырабе шырспажыву. Вінаватых ў недацэнцы і ігнараваньні арганізацыі цэхаў шырокага спажываньня і ўтыльцэхаў неабходна безадкладна прыцягнуць да адказнасьці.

Узяць прыклады швэйнай па барацьбе за шырспажыў

Магілёў. (Наш кар.). Рад прадпрыемстваў Магілеву працягваюць ігнараваць указаньні партыі аб разгортваньні вырабу рэчаў шырспажыву. Указаньне пленуму ЦК УсеКП(б), дзе гаворыцца «пленум прапануе партыйным, камсамольскім, прафсаюзным і савецкіх арганізацыям аказваць усялякую садзейнасьць гаспадарчым арганізацыям і прамкаапэрацыі ў справе разгортваньня вырабу рэчаў шырокага спажываньня і штомесячна правяраць выкананьне ўказаньняў ЦК і СНК і ход вырабу шырспажыву» не знайшло свайго ажыцьцяўленьня ў рабоце Магілёўскіх прадпрыемстваў і арганізацый.

Толькі неразуменьнем гэтых бальшавіцкіх пастаноў партыі, апартуністычнай недацэнкай можна тлумачыць той факт, што на мэблевай фабрыцы плян вырабу шырспажыву выкананы за верасень месяц на 13,6 проц., а на мэталякамбінаце на 69,3 проц.

Ды і чакаць большага нельга было. Дырэкцыя фабрыкі зусім гэтым цэхам ня цікавіцца і лічыць цэх шырспажыву зусім лішнім. Апошні існуе на фабрыцы ў ролі «пасынка». Аб тым, што адміністрацыя ігнаруе цэх шырспажыву яскрава сьведчыць і той факт, што цэх зусім не забясьпечан рабочай сілай. З патрэбных 22 сталяроў ёсьць усяго два. Але і работа гэтых двух рабочых з-за неарганізаванасьці і нераспарадчасьці адміністрацыі праходзіць дарма. Яны работаюць саматужным чынам амаль бяз усякага абсталяваньня.

Калі адміністрацыя лічыць цэх шырспажыву непатрэбным пэхам, дык яна і не клопоціцца каб забясьпечыць яго сыравінай. З-за гэтага бываюць частыя перабоі ў рабоце, адсутнічае сыравіна.

Ня гледзячы на недахоп рабочай сілы ніякіх мер па забесьпячэньні цэху не прымаецца. Было замерабавана некалькі калгасьнікаў з падшэфнага калгасу, але з прычыны дрэнных бытавых умоў яны ўсе разьехаліся.

Фабрычныя арганізацыі замест рашучага адпору такім непартыйным погляданам на працу цэха шырспажывы зьяўляюцца самымі простымі наглядчыкамі. ФЗМК як відаць лічыць непатрэбным праводзіць масавую работу вакол гэтага пытаньня. Значная частка рабочых амаль на знаёма з рашэньнямі партыі па шырспажыве.

Апідненькія адносіны да шырспажыву і на мэталякамбінаце. З дзкады ў дзкаду, з месяцу ў месяц мэталякамбінат ня выконвае пляны таму, што і дырэкцыя ,а разам з ёю і арганізацыі камбінату глядзець і разважаюць, што шырспажыў гэта дробязь і няма чаго, мол, гэтым асабліва займацца».

Як відаць і на мэталякамбінаце яўна ігнаруюцца пастановы партыі, праяўляецца апартуністычная недаацэнка вырабу шырспажыву.

Шоўкавая фабрыка, завод «Зьвязда», чыгунка, друкарня імя Молатава ня гледзячы на вялікую назапашаную адыходаў таксама не займаюцца шырспажывам.

Толькі швэйная фабрыка імя Валадарскага сапраўды ўявіла значэньне вырабу рэчаў шырспажыву, на справе рэалізуе рашэньні партыі.

Тут барацьба за шырспажыў ня зьходзіць з парадку дню работы фабрычных арганізацый.

Чаму фабрыка мае такія добрыя паказьнікі? Таму, што з першых дзён арганізацыі гэтага цэху фабрычныя арганізацыі аддавалі і аддаюць максымум увагі, штодзённа клопоцяцца аб ім, наладзілі апэрацыйнае кіраўніцтва. Па-другое, цэх добра забясьпечаецца сыравінай з адыходаў, поўнасьцю ўкамплектаваны рабочай сілай і неабходнымі прыладамі.

Не малую ролю ў набытых посьпехах адыграла аддаванасьць і ініцыятыў насьць, а таксама і ўмелая арганізацыя работы начальніка цэху тав. Сімховіча.

Вялікую аддаванасьць у справе барацьбы за шырспажыў, за якасьць прадукцыі паказваюць інструктары фабрыкі. Тав. Аронава—камсамолка працуе і за інструктара і за кантралёра, чым зьмяншае накладныя выдаткі цэху.

Работніцы: Будмус Каплан, Гондэльбэрг, Карбіцкая, самі паказваюць лепшыя прыклады работы і арганізуюць іншых рабочых на ўдарныя тэмпы работы, на барацьбу за якасьць.

Апартуністычныя адносіны да выробу шырспажыву мэталякамбінату, мэблевай, заводу «Зьвязда», шоўкавай пабіны атрымаць рашучы адпор.

А. Нёманскі і Д. Алан.

Калгасьнікі прывезьлі збожжа на заг пункт.

Пра зацьвярджаньне катэгорый грамадзян, якія павінны быць вызвалены ад выкананьня абавязкаў сельскіх выканаўцаў

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет народных камісараў БССР па станаўляе:

вызваліць ад выкананьня абавязкаў сельскіх выканаўцаў наступныя катэгорыі грамадзян:

1. Асобы, якія страцілі працаздольнасьць (інваліды працы і вайны);
2. Жанчыны на працягу 8 тыдняў да радоў і 8 тыдняў пасьля радоў.
3. Жанчыны, якія кормяць дзяцей грудзямі.
4. Жанчыны, якія маюць дзяцей да 8 гадоў, калі няма асобы, якая наглядае за імі.
5. Асоб, які знаходзяцца на службе ў кадравых часьцях рабоча-сялянскай Чырвонай арміі і флёту, войска ДПУ, пагранічным войску, канвойнай варце і ваенізаванай ахове, а таксама асоб, якія знаходзяцца ў пераменным складзе тэрытарыяльных часьцей у час зборау..
6. Асоб, якія знаходзяцца на службе ў дзяржаўных, каапэрацыйных грамадзкіх установах і прадпрыемствах.
7. Сем'і чырвонаармейцаў і чырвоных флётцаў, якія маюць аднаго працаздольнага члена сям'і.
8. Хворых, калі яны пададуць даведку лекарска - кантрольных камісій.
9. Старшынь калгасаў, загадчыкаў калгасных фэрм і брыгадзіраў палявых работ.
10. Псыхічна-хворых, вар'яты, асоб, якія знаходзяцца пад апекай.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР Ф. СУЛКОЎСКІ.

Пра становішча ўліку і справаздачнасьці па будаўніцтве

Пастанова Камісіі Выкананьня пры СНК БССР

Камісія выкананьня пры СНК БССР устанаўляе, што пастанова ЭКАНА БССР ад 23 ліпеня гг., № 163, «Пра ўпарадкаваньне ўліку і справаздачнасьці на будаўніцтве» выконваецца зусім нездавальняюча:

а) пры некаторым палепшаньні работы па прадстаўленьні штомесячных аглядаў па Белбудаб'яднаньні і Менбудзе, нездавальняюча выконвае работу Белбудкантора і асабліва Белкамунбуд, якія да гэтага часу ня склалі ніводнага кан'юнктурнага агляду аб ходзе будаўніцтва;

б) ня гледзячы на своячасовае забясьпечаньне ўсіх ведамстваў дастатковай колькасьцю асноўных фармуляраў для ўвядзеньня новай сыстэмы ўліку, няма ніякага зруху ў справе укараненьня новых форм уліку і справаздачнасьці, з прычыны таго затрымліваецца складаньне штомесячнага кан'юнктурнага агляду па будаўніцтве, і атрыманьне неабходных натуральных і фінансавых паказьнікаў аб ходзе выкананьня пляну будаўніцтва;

в) будаўнічыя арганізацыі не звяртаюць увагі на справу ўкамплектаваньня работнікамі вучотных аддзелаў у цэнтральным апараце, так і на будаўніцтве і на ўжыві закладу на падрыхтоўку новых вучотных кадраў.

Камісія Выкананьня пры СНК БССР **пастанаўляе:**

1. Абавязаць кіраўнікоў будаўнічых арганізацый тт. Васэрмана (Белбудаб'яднаньне), Крылова (Менбуд), Кандакова (Белбудканторы) і Бабкіна (Белкамунбуд), неадкладна ўвесьці ўлік на будаўніцтве па новай сыстэме, распрацаванай ЦУНХУ СССР з такім разьлікам, каб забясьпечыць атрыманьне неабходных вестак, пачынаючы з кастрычніка месяца гэтага году.
2. Абавязаць кіраўнікоў усіх бударганізацый і начальнікаў будаўніцтва на працягу дзкады выканаць пастанову ЭКАНА за 23-VII г. г. аб вылучэньні на будаўніцтвах тэхнічна-пісьменных асоб, адказных за станоўчага ўліку на пабудовах і своячасовае прадстаўленьне штомесячных і гадавых справаздач у кіраўніцтва Народна-гаспадарчага ўліку БССР і аб выкананьні гэтай пастановы паведаміць Камісію Выкананьня не пазьней 5 лістапада г. г.
3. Прапанаваць усім ведамствам і арганізацыям — адначасова з прадстаўленьнем у адпаведныя банкі справаздачнасьці аб ходзе будаўніцтва, накіроўваць адбіткі гэтай справаздачнасьці ў кіраўніцтва Народна-гаспадарчага ўліку БССР.

Даручыць усім банкам прасачыць за выкананьнем ведамствамі і ўстановамі гэтай пастановы.

4. Даручыць кіраўніцтву Народна-гаспадарчага ўліку БССР не пазьней 20 лістапада паведаміць Камісіі Выкананьня аб выкананьні гэтай пастановы і рэальных выніках дасягнутых у галіне ўпарадкаваньня ўліку і справаздачнасьці на будаўніцтве.

Нам. старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР І. ЛЫЧОЎ.
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР Я. ЭЛЬКІН

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай ССР

Пра ослабаненьне тав. Ляўкова М. А. ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

У зьвязку з пераходам на іншую работу ослабаніць тав. ЛЯЎКОВА, Максіма Архіпавіча ад абавязкаў Народнага Камісара Юстыцыі БССР і Пракурора Рэспублікі

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ
Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ
19 кастрычніка 1932 г
гор. Менск.

Нацыянальна-культурнае будаўніцтва БССР да ХУ гадавіны Кастрычніка*)

С. Я. Вальфсон

Пятнаццатая гадавіна Кастрычніка—вялікае сьвята рабочае клясы і ўсіх працоўных мас Савецкага Саюзу, вялікае сьвята рабочае клясы, працоўных і прыгнечаных мас усяго сьвету.

«Выключнае міжнароднае значэньне гэтай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі заключаецца ў тым, што ленінскае тэарэтычнае палажэньне аб магчымасьці перамогі сацыялізму ў адным краіне пераварылася ў сапраўднае жыцьцё, вывялічанае пятнаньне нашых ворагаў, даючы бадзёрую ўпэўненасьць у канчатковай перамозе сацыялізму рабочай клясай усяго сьвету» (Молатаў).

У капіталістычным сьвеце ўсё больш абвастраецца эканамічны крызіс, разам з тым нарастае рэвалюцыйны бадзьм, павялічваюцца супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі, узмацняецца падрыхтоўка ваеннага нападу на СССР.

Савецкі саюз канчаткова замацаваў ся на сацыялістычных пазіцыях, дабіўшыся посьпехаў усясьветна-гістарычнага значэньня ў індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскай гаспадаркі і ажыцьцяўленьні культурнай рэвалюцыі.

Савецкая Беларусь зьяўляецца адным з лепшых прыкладаў таго, як СССР—вялікі братэрскі саюз працоўных звыш 150 нацыянальнасьцяй, вызваленых Кастрычнікам—вывёў гэтыя нацыянальнасьці на сацыялістычны шлях «забясьпечваючы і падтрымліваючы ўсімі сіламі і сродкамі савецкай дзяржавы нацыянальныя культуры, вызваліўшыяся ад капіталізму нацыры пасьлядоўнай пралетарскай лініі ў справе развіцьця і зьместу гэтых культур» (З праграмы Камінтэрну).

Пятнаццаць гадоў пралетарскай дыктатуры пераварылі эканамічна і культурна адсталую вёраіну, якой Беларусь зьяўлялася пры царызьме. У індустрыяльна-калгасную рэспубліку, якая на самай мяжы з капіталістычным сьветам пасьпяхова будуе сацыялізм.

Гэтых грандыёзных посьпехаў БССР дабілася дзякуючы дыктатуры пралетарыяту пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе Цэнтральнага камітэту, пры брацкай дапамозе пралетарыяту усяго Савецкага Саюзу. Гэтыя посьпехі—вынік няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, на варце якой стаіць ленінскі ЦК УсеКП(б) на чале з правадыром партыі і рабочае клясы тав. І. В. Сталіным. Гэтыя посьпехі—ёсьць вынік пасьлядоўнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, бязьлітаснай барацьбы з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, з контррэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі, яны дасягнуты ў жорсткай клясавай барацьбе, у барацьбе на два фронты з усялякімі адхіленьнямі ад генэральнай лініі партыі, супроць правага і «левага» апартунізму. і прымірэньства.

На базе гістарычных перамог сацыялістычнай эканомікі, пасьпяховай індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі разгортваліся і грандыёзныя посьпехі культурнай рэвалюцыі ў БССР.

Мы маем на мэце паказаць галоўныя і асноўныя факты, якія сьведчаць аб гэтых посьпехах, падвесьці кароткія вынікі нацыянальна-культурнага будаўніцтва Савецкай Беларусі. Раней, чым перайсьці да паасобных галін гэтага будаўніцтва, падамо толькі два факты, якія паказваюць пі ганіцкі размах культурнай рэвалюцыі ў БССР.

Расходы на народную асьвету ў гэтым годзе займаюць ў нас 1/3 усяго рэспубліканскага бюджэту і амаль ½ усяго раённага бюджэту.

Камуністычным выхаваньнем ў нас ахоплена 2.000.000 чалавек. Інакш кажучы, у нас выхоўваюцца і навучаюцца 2 з кожных 5 чалавек насельніцтва.

Ці патрэбны нрасамоўныя доказы таго, што «пэрыяд дыктатуры пралетарыяту і будаўніцтва сацыялізму ў СССР—ёсьць пэрыяд росквіту нацыянальных культур, сацыялістычных па зьмесце і нацыянальных на форме». (Сталін)...

Дашкольнае выхаваньне

Дашкольнае выхаваньне—адзін з найбольш адказных участкаў вялікага фронту камуністычнага выхаваньня. Задачай дашкольнага выхаваньня зьяўляецца, з аднаго боку, даць магчымасьць жаночае прыняць удзел ў грамадзка-падітычным, жыцьці краіны, у сацбудаўніцтве, аслабаніўшы яе ад клапот ад дзецях; з другога боку, на гэтым фронце павінны быць выхаваны мільёны актыўных, жыцьцёрадасных будаўнікоў сацыялізму.

Дашкольнае выхаваньне—ёсьць дзіця Кастрычніка, яго рост і разьвіцьцё зьяўляецца арганічнай часткай агульнага ўздыму сацыялістычнай будоўлі.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў БССР былі адзінкі прыватных дзіцячых садоў, якія былі даступны нязначнай частцы буржуазных дзяцей. Яны выхоўвалі дзяцей адпаведна запатрабаваньням існуючага буржуазнага ладу. Упяршыню ў гісторыі чалавецтва савецкая ўлада змагла падыйсьці да пастаноўкі пытаньня дашкольнага ўсенавучу.

У галіне пашырэньня сеткі дашкольных устаноў ёсьць наступныя дасягненьні: паводле пляну на 1933 год мы павінны ахапіць 60 проц. дзяцей да школьнага ўзросту; да канца другой пяцігодкі забясьпечыць усіх дзяцей да школьнага ўзросту выхаваўчымі ўстановамі.

Зараз у нашых дашкольных установах выхоўваецца 178.000 дзетвары, су проц. 60.000 мінулага году.

Аб нашых дасягненьнях у галіне пашырэньня сеткі дашкольных устаноў яскрава сьведчаць наступныя лічбы:

Гады	1925-26	1926-27	1927-28	1929-30	1930-31	1931-32	Паводле пляну 1933 г.
Устаноў	52	71	90	494	12 0	3356	9138
Дзяцей	2221	3424	4311	17400	39837	111616	294619

Характэрнай лічбай парауньваньня зьяўляецца разгортваньне сеткі ва ўмовах сельскай гаспадаркі.

У 1925-26 годзе мы мелі 4 установы, што абслугоўвалі 121 дзіця, тады як у гэтым годзе ўлетку працавала 6 тысяч дзіцячых пляцовак, якімі было ахоплена 200 тысяч дзетвары.

Мы маем дасягненьні з боку пастаноўкі работы ў гэтых установах. Так, рабочы дзень дашкольных устаноў, якія абслугоўваюць работніц прадпрыемстваў, працягваецца в 10 гадзін дня да 12 гадзін ночы з тым, каб работніца, якая працуе 7-8 гадзін мела магчымасьць апрача сваёй работы на вытворчасьці прыняць удзел у грамадзкай рабоце і вучобе.

Усе дашкольныя ўстановы, сады-аачагі, працуюць круглы год. У гэтым годзе частка ўстаноў выяжджалі з гораду ў летняя калёніі, дзе былі створаны адпаведныя ўмовы для аздараўленьня дзетвары.

У буйнейшых прамысловых цэнтрах некаторыя дашкольныя ўстановы працуюць круглыя суткі з тым, каб работніца, якая працуе на вячэрняй і начной зьмене на вытворчасьці, магла пакідаць дзяцей у дзіцячым садзе ў часе сваёй работы. Значная частка дашкольных устаноў працуюць бесплатнымі тыдзень, што дае магчымасьць бацьком быць вольнымі ў дні адпачынку.

Дашкольныя ўстановы забясьпечаны адпаведным абсталяваньнем і інвэнтаром. Да пытаньня дашкольнага выхаваньня прыцягнута актыўнасьць, іні цыятыва і сродкі шырокіх працоўных мас (32 г.—3,5 млн. руб. апрача 4,5 млн. руб. паводле бюджэту).

Дзякуючы правільнаму вырашэньню нацыянальнай палітыкі, нашы дашкольныя ўстановы прыстасаваны да абслугоўваньня нацменшасьцяй. У нас ёсьць дашкольныя ўстановы на пяці мовах.

У барацьбе за выкананьне пастаноў партыі аб палепшаньні якасьці работы ў дашкольных установах мы дабіліся значных посьпехаў ня толькі колькаснага парадку, але і ў галіне ўзьнаўцыя якасьці работы. Удаскана лен зьмест і формы работы з дзецьмі дашкольнікамі настолькі, што мы змаглі прыступіць да распрацоўкі, і ўпэўнена выдалі праграмы дашкольных устаноў, ХУ гадавіну Кастрычніка на дашкольным фронце суспрацаем афармленымі і выданымі праектамі праграм па ўсіх галінах дзейнасьці дашкольных устаноў, якія дапамогуць на саваму работніку правільна арганізоўваць пэдагагічны працэс у дашкольнай установе.

Асноўная маса пэдагогаў—дашкольнікаў аразумела значэньне камуністычнага выхаваньня дзяцей, наближэньне дзяцей да сучаснасьці, да ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве. Нашы дзеці ў дашкольных установах выхоўваюцца на аснове працоўна-палітэхнічнай дзейнасьці, яны знаёмяцца з сучасным грамадзкім жыцьцём, знаёмяцца і наглядаюць прыродныя зьявы.

Разгортваючы бальшавіцкія тэмпы дашкольнага будаўніцтва, мы разам з гэтым змагаемся за такія дашкольныя ўстановы, якія выхоўваюць фізічна-моцнае пакаленьне, якія даюць дзіцяці радасныя, бадзёрыя эмоцыі, якія спрыяюць разьвіцьцю ініцыятыўнага, творчага, актыўнага будаўніка сацыялізму, якія разьвіваюць у дзецях матэрыялістычны сьветапогляд, якія кроўна зацікаўліваюць дзяцей гераічнай барацьбой пралетарыяту з сусветнымі эксплёататарамі, якія прывіваюць дзецям любоў да нашага сацыялістычнага будаўніцтва і выхоўваюць у іх жаданьне быць у радах будаўнікоў сацыялізму.

За апошні час выдан рад мэтадычных дапаможнікаў па розных пытаньнях арганізацыі і зьместу работы дашкольных устаноў.

Побач з вялізарнейшымі дасягненьнямі ў галіне дашкольнага выхаваньня мы маем і недахопы, якія выражаюцца ў тым, што ня ўсе работнікі дастаткова чотка ўсвоілі зьмест, формы і мэтады работы. У частцы дашкольных устаноў ёсьць перагрузка дзяцей матар'ялямі, у іншых-ока—дзеці наадварот—зайвіна аддаены самім сабе. Не дастаткова наладжана работа па фізычным выхаваньні дзяцей. Заўважаецца недацэнка ролі гульні і момантаў мастацкага выхаваньня ў дашкольным узросьце.

Для шпаркага разгортваньня дашкольнай сеткі і для правільна наладжанага пэдагагічнага працэсу дашкольнай установы, нам патрабуецца вялікая армія работнікаў дашкольнага выхаваньня, работнікаў, на якіх укладаецца адказнейшая задача па выхаваньні будаўнікоў сацыялізму. Для гэтай мэты разгорнута сетка дашкольных тэхнікумаў, курсаў, апрача гэтага рыхтуем кадры для падрыхтоўкі кадраў (2 дашкольных аддзяленьні пры ВНУ). Значна палепшаны сацыяльны склад дашкольных кадраў. Мы маем шмат работніц - выдвіжэнак з вытворчасьці і калгасаў, дзяцей і ўтрымацаў рабочых. Значная частка работнікаў ахоплена рознымі відамі павышэньня кваліфікацыі.

Аднэй з форм удзелу ў справе дашкольнага будаўніцтва працоўных мас зьяўляецца дашкольная каапэрацыя, якую неабходна шырока папуляризаваць.

Каб пасьпяхова ажыцьцяўляць пастаўленыя партыяй і ўрадам задачы па дашкольным усенавучу, неабходна прыцягнуць ініцыятыву шырокай грамадзкасьці, укараніўшы ў масы думку аб значэньні дашкольнага выхаваньня, як неадымнай часткі нашага сацбудаўніцтва.

Ліквідацыя няпісьменнасьці

У цяжкай спадчыне культурнай адсталасьці, якую царызм пакінуў народам Савецкага саюзу, няпісьменнасьць займае адно з першых месц. Няпісьменнасьць мас палятчала пануючым клясам царскай Расіі эксплёатаваць працоўных, трымаць іх пад уладай рэлігійнага дурману.

Спадчына — няпісьменнасьць цяжка давіла на Савецкую Беларусь: на кожныя 100 чалавек насельніцтва ў дарэвалюцыйнай Беларусі прыходзілася ганебная лічба ў 70 няпісьменных. Барацьба з гэтай спадч

Прадаюць трусы на калгасным кірмашы.

50 ПРОЦ. ФІНПЛЯНУ IV КВАРТАЛУ—

да XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі

Пазыкатрымальніку—максымальную ўвагу

Сродкі ад дзяржаўных пазык маюць вялізарнае значэньне ў справе сацыялістычнага будаўніцтва, у перабудове вёскі па шляху калектывізацыі. Цяжка зараз знайсьці рабочага, служачага, калгасьніка, які-б ня меў аблігацыі масавых пазык. Адгэтуль і асноўная задача камсодаў і фінансава - ашчаднага апарату, як найлепш абслужыць мільённую армію пазыкатрымальнікаў. Ад якаснага абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў залежаць і посьпехі ў справе рэалізацыі пазык.

На жаль, трэба адзначыць, што абслугоўваньне пазыкатрымальнікаў не пастаўлена на належную вышыню. Ёсьць рад выпадкаў калі падпісчык падпісваецца на пазыку, выплачвае поўнасьцю прошы за яе, але ня можа атрымаць ня толькі аблігацый, але і замацаваных за ім талёнаў. І як вынік па БССР на сёньняшні дзень ёсьць нерозданых аблігацый на суму каля 2-х мільёнаў руб.

Нізавыя камсоды на прадпрыемствах, установах, саўгасах, калгасах і МТС яшчэ не зрабілі сапраўднымі дапаможнікамі па абслугоўваньні пазыкатрымальнікаў, не перабудавалі сваёй работы па-новаму з тым, каб кожны працоўны адчуваў, што пазыка не зьяўляецца як-быццам падаткам—як варожа - кулацкі элемэнт агітуе, а што аблігацыі на руках у працоўнага, зьяўляюцца дакумантам удзелу яго ў сацыялістычным будаўніцтве і індустрыялізацыі краіны.

Нельга абыйсьці таго, што ў радзе ашчадкас даведачна - кансультацыйная работа пастаўлена з рук вон дрэнна. У радзе раёнаў гаррайкамсоды ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў справе рэалізацыі пазыкі, ня кіруюць іх работы, не займаюцца пытаньнямі абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў. Райкамсоды не бяруць пад абстрэл ашчадны апарат, які павінен давець нізавым камсодам тэхнічны інструктаж для калектываў, да якіх яны прымацаваны.

Гарэайкамсоды павінны рашуча пастаўць пытаньне перад ашчадным апаратам з тым, каб забясьпечыць тэхнічны інструктаж нізавых камсодаў. Патрэбна зараз-жа дабіцца максымальнага ажыўленьня работы нізавых камсодаў, заслухаць на агульных сходах іх справаздачнасьці, замяніць недастаючыя сельсаветы і ашчадкасы павінны зараз-жа шырока разгарнуць масавую работу па вярбоўцы новых укладчыкаў, мабілізаваўшы на гэту работу шырокія колы грамадзкасьці.

Райком камсамолу павінен заслухаць справаздачу тых ячэек, якія не дапамагаюць у рабоце ашчадкасы, ня выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы ў галіне шэфства над ашчадкасай.

Трэба па ўсіх сельсаветах стварыць буйсірныя брыгады па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнага сэктару, і на аснове масавай растлумачальнай работы павесьці штодзённую работу па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, асабліва па дабраахвотных плацяжох.

П. Кавалёў.

За выкананьне фінпляну IV кварталу

СМАЛЯВІЧЫ. (Наш кар.). Паказьнікі ходу выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу на 20 кастрычніка яўна нездавальняючыя. Пасобныя сельсаветы і ашчадкасы, як Прылепская, Драчкоўская, Жодзінская і каса пры торфазаводзе «Чырвоны Сьцяг» сарвалі выкананьне фінпляну па дабраахвотных плацяжох, ня выканаўшы ніводнага процанту кантрольнага заданьня. Загадчыкі гэтых ашчадкас і старшыні сельсаветаў не ўявілі сабе важнасьці выкананьня фінпляну па дабраахвотных плацяжох, з прычыны чаго плян па раёне на 20 кастрычніка па фізічных укладаньнях выкананы ўсяго на 13 проц., а па пазыцы—на 4 проц.

Гэтыя паказьнікі стваряюць пагрозу зрыву выкананьня фінпляну. Адстаючыя сельсаветы і ашчадкасы павінны зараз-жа шырока разгарнуць масавую работу па вярбоўцы новых укладчыкаў, мабілізаваўшы на гэту работу шырокія колы грамадзкасьці.

Райком камсамолу павінен заслухаць справаздачу тых ячэек, якія не дапамагаюць у рабоце ашчадкасы, ня выконваюць узятыя на сябе абавязацельствы ў галіне шэфства над ашчадкасай.

Трэба па ўсіх сельсаветах стварыць буйсірныя брыгады па рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнага сэктару, і на аснове масавай растлумачальнай работы павесьці штодзённую работу па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, асабліва па дабраахвотных плацяжох.

П. Кавалёў.

Транспарт

Разгорнутая падрыхтоўка ВЫРАШАЕ ПОСЬПЕХ КОНКУРСУ

Здаровы паравоз павінен цягнуць здаровыя вагоны

«Наперад, баявыя таварышы! Чыгуначнікі, ваш абавязак своячасова дастаўляць заводам сыравіну і апал, новым гігантам сацыялістычнай індустрыі—лес і будаўнічыя матар'ялы, рыбочым—хлеб і харчовыя грузы, вёскі—тавары і сельска-гаспадарчыя машыны. Вышэй тэмпы пагрузкі! У баявую гатоўнасьць паравозны і вагонны паркі, у баявую гатоўнасьць чыгуначныя магістралі! Выкананьне плянаў перавозак—лепшы падарунак да Кастрычніка».

Такі выклік да ўсіх рабочых і работнікаў транспарту кінулі перадавыя ленінградзкія прадпрыемствы ў сваім адкрытым лісьце да XV гадавіны СССР.

Выклік ленінградзкіх рабочых, які адбівае ў сабе рахунак усяе краіны да чыгуначнага транспарту, патрабуе самай рашучай аплаты і ўзмацненьня тэмпаў работы на чыгуначным транспарце. Аднак, ня ўсё яшчэ зроблена для таго, каб працаваць бесьперабойна і чотка, транспарт яшчэ мае ў сваёй рабоце рад істотных і глыбокіх прарываў асабліва ў аздараўленьні вагоннай гаспадаркі, часткова ў аўсні зацы працы паравозной гаспадаркі і аддзелаў эксплёатацыі.

Паравоз і вагон на ўвесь час асеньня - зімовых перавозак зьяўляюцца рашаючымі зьвеньнямі работы, ад становішча і здароўя якіх залежыць пасьпяховы ход выкананьня ўсяго транспляну.

Першыя конкурсы спараных брыгад, якія праводзіліся сярод перадавых паравозьнікаў Савецкага Саюзу паказалі невычарпальныя магчымасьці, якія мае транспарт у галіне аздараўленьня паравознага парку. Конкурсы спараных брыгад уцягнулі ў сацыялістычнае спаборніцтва работнікаў і іншых службаў — рамонтныя брыгады, пасасобныя абменныя пункты, дыспэтчары і г. д. Улічваючы вялікія посьпехі прайшоўшых двух конкурсаў, якія ўзьнялі працоўную сацыялістычную дысцыпліну на транспарце, «Правда», НКШЗ, ЦК чыгуначнікаў і «Гудок», ідучы насустрач масавым патрабаваньням чыгуначнікаў, арганізуюць трэці ўсесаюзны конкурс спараных брыгад імя XV гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, тэрмінам з 1-га сьнежня 1932 году да 1-га лютага 1933 году.

У гэтым конкурсе прымаюць непасрэдны ўдзел рабочыя вагоннай службы, у спаборніцтва ўцягваюцца абменныя пункты, рамонтныя і кандуктарскія брыгады, змазчыкі і г. д. «Здаровы паравоз цягне здаровыя вагоны»—пад такім лёзунгам праводзіцца трэці конкурс.

Чыгуначнікі БССР сустракаюць конкурс новым уздымам творчага энтузіязму. У радзе дэпо Заходняй і МБЕ чыгунак праведзены ўжо адборачныя спаборніцтвы, пачата шырокая растлумачальная работа.

Падрыхтоўка да конкурсу таксама выявіла і недахопы, якія крыюцца ў аздараўленьні паравознай гаспадаркі, некаторае зьніжэньне сьледваньня цягнікоў паводле раскладу (Жлобінскі раён), выпадкі зрываў спаранай (Віцебскі раён).

У далейшым ходзе спаборніцтва трэба ўлічыць усе гэтыя недахопы, каб шырэй машней і з большымі посьпехамі сустрэць старт трэцяга конкурсу спараных.

ХУ гадавіну Кастрычніка чыгуначныя рабочыя БССР сустракаюць цэлым радам бясспрэчных і вялізарных перамог, дасягнутых імі ў рашучай барацьбе за сацыялістычную рэканструкцыю транспарту. Трэба мабілізавацца на ліквідацыю ўсіх «вузкіх» месц, на падцягваньне адстаючых участкаў, каб Кастрычніцкія сьвяты сустрэць поўным выкананьнем транспляну, посьпехамі ў дзейнай барацьбе за аздараўленьне паравознага і вагоннага паркаў.

Паравоз імя газ. „Савецкая Беларусь" вылучаны для ўдзелу ў конкурсе

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Скончаны месячнік адборачнага спаборніцтва спараных брыгад, на якім выяўляліся лепшыя па сваёй рабоце паравозы для вылучэньня іх на старт трэцяга конкурсу спараных брыгад.

На чале паравозаў Жлобінскага раёну стаў паравоз сэрыі № 5471, Асіпавіцкага дэпо (брыгады Ліпскага і Вайцэхоўскага). Яго работа за месяц ацэнена ў 492 балы на плюс. Паравозы Асіпавіцкага дэпо наогул паказалі, што падрыхтоўка тут праходзіла лепш чым у астатніх дэпо раёну. З Асіпавіцкага дэпо для ўдзелу ва Ўсесаюзным дарожным і раённым конкурсах вылучана 11 паравозаў, са Жлобінскага—7 і з Магілёўскага—7.

Паравоз Жлобінскага дэпо Щ—1689 імя газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» (брыгады Хохава і Трушкевіча) атрымаў 236 балаў на плюс і вылучаны для ўдзелу ў дарожным конкурсе.

Тэрмін падрыхтоўкі да конкурсу працягнуты да 15 лістапада. У гэты дзень будзе даны старт конкурсу. Яшчэ да старту паравозы раёну павінны даць высокія паказьнікі работы, каб з якаснай разьбежкай пачаць барацьбу за пяршынства. На гэта павінны быць мабілізаваны ўсе паравозьнікі.

Ташын.

Дэпо Ворша выконвае ўзятыя самаабавязацельствы

ВОРША. Дэпо станцыі Ворша ў пэрыяд першага і другога конкурсаў дагналося значных посьпехаў. Дэпо атрымала пераходны сьцяг шляху. Машыністы Аляксееў і Славіч атрымалі ганаровую грамату лепшых машыністаў СССР. Да ХУ гадавіны Кастрычніка рабочыя, служачыя і ІТР прыходзяць з наступнымі дасягненьнямі: процант хворых паравозаў пры заданьні 9,29 даведзены да 7,7. Сярэдняя - сутачны прабег таварнага паравозу пры заданьні ў 170,3 клм, — дасягнае 196,. Да сягнута эканомія апалу на 9 проц., на пяць дзён раней тэрміну скончаны рамонт 39 паравозаў замест 34 паводле пляну. У галіне палепшаньня культурна - бытавога абслугоўваньня рабочых ёсьць цэлы рад посьпехаў. Заканчваецца пабудова фабрыкі-кухні, душкамбінату пры дэпо, адкрыты дзесятка ясьляў, арганізавана майстэрня па рамонце абутку і вопраткі.

Але, поруч з дасягненьнямі ёсьць яшчэ і цэлы рад буйных недахопаў, наглядаецца зрыў спаранай язды, канчаткова не ліквідавана паўторнасьць рамонту, ня ўведзена табельнае замацаваньне процанту хворых паравозаў, ня выконваецца заданьне па нормe прабегу пасажырскіх паравозаў.

У сваім адказе на ліст маскоўскакурскіх паравозьнікаў аб арганізацыі трэцяга конкурсу спараных брыгад, да якога цалкам далучыліся рабочыя, служачыя і ІТР дэпо Воршы — рабочыя абавязаліся цалкам ліквідаваць у бліжэйшы час гэтыя недахопы. (Белта).

Стаць у рады перадавых

Віцебск. На Віцебскім вузьле, які адыгрывае вялікае значэньне ў сыстэме перавозак па чыгуначнай сетцы БССР, наглядалася значнае адставаньне на паасобных вучастках у галіне выкананьня трансфінпляну. Раён ніяк ня мог заняць перадавога месца па перавозках, дрэнная работа дэпо, нездавальняючая якасьць рамонту і няпоўнае скарыстаньне вагоннага парку цягнулі выкананьне трансфінпляну ўніз.

Трэці конкурс спараных у раёне скарыстоўваюць для таго, каб рашучым чынам падцягнуць адстаючыя вуткі. Выходзячы з гэтага, па раёне разгортваецца шырокая растлумачальная работа, рад паравозаў ідуць у перадавых калёнах лепшых паравозьнікаў БССР. Старыя кадравікі—паравозьнікі дэпо Віцебск зьвярнуліся з лістом да ўсіх рабочых і ІТР дэпо і вагоннай гаспадаркі Віцебску, Полацку і Нова-Сакольніку. Падводзячы вынікі ранейшай работы, кадравікі-паравозьнікі ўзялі на сябе рад самаабавязацельстваў і заклікалі ўсіх чыгуначнікаў уключыцца ў актыўную барацьбу за аздараўленьне паравознай і вагоннай гаспадарак.

На нарадзе старых паравозьнікаў, скліканай у раёне, рабочыя падзялялі ся вопытам сваёй барацьбы за здаровы паравоз. Маючы на ўвазе, што ў раёне ёсьць шмат недахопаў у замацаваньні спаранай язды, паравозьнікі далі шмат прапаноў для іх зьніжэньня. Паравозьнікі патрабавалі рашучых мер да парушыцеляў працоўнай дысцыпліны, мабілізацыі грамадзкай думкі вакол выпадкаў зрываў спараных.

П.

Транспартны дом тэхнікі МБЕ чыгункі ў Менску

Вясною 1933 году дырэкцыя МБЕ чыгункі прыступае да пабудовы ў гарадзе Менску Дому тэхнікі.

Дом тэхнікі будзе абслугоўваць ня толькі чыгуначны вузел гор. Менску, але і наогул усіх транспартнікаў Беларускай рэспублікі.

Дом тэхнікі зьявіцца базай усіх відаў тэхнічнай прапаганды і будзе садзейнічаць шырокім масам чыгуначнікаў аўладаць тэхнікай рэканструяванага транспарту. Уся работа Дому тэхнікі, экспазіцыя яго аддзелаў будуць пабудаваны на аснове марксысцка - ленінскага мэтаду і дыялектычнага матарыялізму.

Адначасова Дом тэхнікі зьявіцца цэнтрам масавай, арганізацыйнай і вучэбна - мэтадычнай работы па тэхнапрапагандзе і базай для правядзеньня сыстэматычнай лекцыйнай работы. Нарэшце, Дом тэхнікі зьявіцца цэнтрам усіх тэхнічных транспартных зьездаў і канфэрэнцый.

У сувязі з гэтым Дом тэхнікі будзе складацца з наступных аддзелаў:

1. Вытворча - паказальны аддзел у складзе сэктароў: цягі, электрыфікацыі, шляхоў і новага будаўніцтва, эксплёатацыі, СЦБ і сувязі.
2. Аддзел масавай работы: кіно-залі, аўдыторыя, габінэты для гурткоўых заняткаў, дзіцячая тэхнічная станцыя.
3. Тэхнічная бібліятэка.
4. Майстэрні і мадэльная.

Эскізны праект Дому тэхнікі ў сучасны момант ужо распрацаваны архітэктарамі дырэкцыі МБЕ чыгункі тт. СТРУКАВЫМ і КАЛЕНДО.

Дом тэхнікі прызначана пабудаваць на вакзальнай плошчы. НК шляхоў зносін на пабудову Дому тэхнікі асыгнуе 500.000 руб.

Дырэкцыя МБЕ чыгункі ўпэўнена ў тым, што з дапамогаю партыйных, прафэсіянальных, грамадзкіх арганізацый, таксаму друку БССР, яна хутка вырашыць гэтую задачу па пабудове. Акрамя таго, дырэкцыя ўпэўнена, што навуковыя працаўнікі Маскоўскага Сталінскага эксплёатацыйнага інстытуту інжынэраў транспарту, ў асобе сталінскай эстафэты тэхнапрапаганды на транспарце, прынясуць гэтай справе рэальную дапамогу і мабілізуюць працаўнікоў навукі і тэхнікі Беларусі на пабудову Дома тэхнікі.

Дырэктар МБЕ чыгункі
РУСАКОЎ

Нач. Аддзелу тэхнапрапаганды МБЕ чыгункі ГУРЭВІЧ.

Павышэньне ўраджайнасьці—асноўнае зьвяно работы на вёсцы

«Асабліва буйныя прарывам трэба лічыць адсутнасьць наладжанай барацьбы за павышэньне ўраджайнасьці і ўкараненьне агратэхнікі (з рэзалюцыі ліквідыскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б).

Калгасны сэктар сельскай гаспадаркі БССР прыходзіць да ХУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі з буйнымі дасягненьнямі. Ад 416 калгасаў у 1927 годзе, пабудаваных пераважна на зямлі былых памешчыцкіх маёнткаў, на сёньняшні дзень у нас ёсьць 3807 калгасаў, у якіх аб'яднана 41 проц. сялянскіх гаспадарак БССР.

Каб поўнасьцю адлюстраваць значэньне гэтых посьпехаў, варта ўспомніць, што ў 1928 годзе на II зьезьдзе калгасаў ставілася задача дамагчыся ў канцы пяцігодкі 20 проц. калектывізацыі. Жыцьцё выпередзіла гэтыя пізэрныя задачы. Пад бальшавіцкім кіраўніцтвам партыі ў СССР разгарнуўся шпаркі рух калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Посьпехі, дасягнутыя ў галіне калгаснага будаўніцтва настолькі значныя, што ні апітацыя кулацкіх элемэнтаў, ні галавацяпства паасобных работнікаў ня могуць ужо пахіснуць калгаснага руху. За апошнія два гады калгасы паказалі, што буйная сацыялістычная гаспадарка дае яўную перавагу перад дробнай аднаасобнай. Калгасная гаспадарка дае значны гаспадарчы эфэкт у выкарыстоўваньні інвэнтару, рабочай і цягавой сілы. Напрыклад, на аднаго рабочага каня ў час веснавой сяўбы 1932 году прыпадала ў сярэднім па 4,68 га пасеву, замест 2,7 га ў аднаасобніка. У галіне разьвіцьця жывёлагадоўлі, стварэньня кармовай базы, у справе ўмацаваньня тэхнічнай базы прамысловасьці (лёнаводзтва і інш.), у справе арганізацыі і пераапрацоўкі ўсіх сельска-гаспадарчых прадуктаў і выкідваньні сельска гаспадарчых лішкаў—калгасы значна выпередзілі аднаасобнікаў.

Апошнія мерапрыемствы партыі і ўраду-дырэктыва ЦК УсеКП(б) аб стварэньні сталых брыгад, пастанова аб забароне прымусовага апрамаджаваньня жывёлы, законы аб сельскагаспадарчым падатку, загатоўках, калгасным гандлі, мясазагатоўках і г. д.—яшчэ больш зацікавілі калгасьніка за ўмацаваньні калгаснай вытворчасьці. Гэтая павялічаная зацікаўленасьць калгасьніка ў разьвіцьці вытворчасьці свайго калгасу ўжо сёлета, асабліва ў часе ўборачнай кампаніі, выявілася на практыцы. У калгасе «Чырвоны баец, Дзяржынскага раёну на працягу 6 начэй калгасьнікі вазілі збожжа з поля, каб папярэдзіць страты ад дажджу. Гэты калгас ня толькі своячасова ўбраў свае 70 га зярнёвых культур, але паслаў 44 калгасьнікі на дапамогу суседнему калгасу імя СНК БССР. У выніку ўдарнага правядзеньня ўборачнай калгас ужо на 1 верасьня цалкам выканаў плян па розных загатоўках.

Мы маем цэлы рад і іншых калгасаў, якія па-бальшавіцку змагаюцца за своячасовае правядзеньне сяўбы і ўборкі ўраджаю. Калгас «Чырвоны сьцяг» (Магілёўскі раён) да 9 верасьня закончыў сяўбу азімых, да 10 верасьня цалкам выканаў загатоўкі. Гэты калгас вылучыў буксірную брыгаду на дапамогу ў правядзеньні сяўбы аднаасобнікам суседняй вёскі. Такіх прыкладаў безьліч, мы маем сотні калгасаў, якія з бальшавіцкай упартасьцю змагаюцца за разьвіцьцё сваёй гаспадаркі, за ўмацаваньне сваёй вытворчасьці, за павышэньне ўраджайнасьці.

Мы маем рад паказьнікаў, якія сыгналізуюць, што за апошнія гады зьнізілася ўраджайнасьць амаль па ўсіх культурах. Калгасы амаль не дамаглі ся больш высокага ўраджаю, чым у аднаасобным сэктары. Калі ў 1928 г. калгасы атрымалі ў сярэднім з 1 га 7,9 цэнтр. жыта, дык у 1931 г. ураджай зьнізіўся да 6,2 цэнтр., у 1932 г.—6 цэнтр.

Павышэньне ўраджаю залежыць ад двух момантаў. Перш-падрыхтоўка глебы; зяблівае ворыва, своячасовае правядзеньне сяўбы, ужываньне неаб ходнага ўгнаеньня, увядзеньне правільнага севазвароту і інш. Другі момант—гэта ахова ўраджаю: праполка, абворваньне, барацьба са шкоднікамі, своячасовая ўборка бяз страт.

Што мы маем ва ўсіх галінах па павышэньні ўраджайнасьці? Возьмем севазварот. У мінулую весну НКЗБ апублікаваў папярэдніе праекты севазвароту. Але яны да гэтага часу канчаткова не распрацаваны. Практычнага ажыцьцяўленьня севазвароты не атрымалі.

Ня лепш пастаўлены справы з забясьпечаньнем гаспадарак угнаеньнем. Зельмі часта мізэральныя ўгнаеньні ў выніку дрэннага кіраўніцтва акцыянэрнага т-ва «Мінугнаеньне» замест таго, каб папасьці на палі, вываротваюцца пад адкосы. На шматлікія запатрабаваньні Калгасцэнтру і калгасаюзаў «Мінугнаеньне» дае адзін дазвол: «Угнаеньняў не хапае, імі будуць забясьпечаны толькі калгасы МТС. А на справе Крычаўскі фасфарытны завод загружаны гатовай прадукцыяй і з гэтае прычыны ў ервасьні ён быў прымушаны апавясьціць усе калгасы, каб яны прыехалі браць угнаеньне.

Другое важнейшае мерапрыемства па павышэньні ўраджайнасьці—зяблівае ворыва—таксама яўна недаацэньваецца ў раёнах. На 25 кастрычніка плян зяблівы па калгасным сэктары выкананы толькі на 31,5 проц. Між тым зяблівы павінна было быць скончана да гэтага часу. Райза і райкалгассаюзы не разгарнулі, як сьлед, барацьбы за зяблівы, барацьбы за высокі ўраджай.

У галіне аховы ўраджаю ў гэтым годзе мы дамаглісь значнага пералому. Значна лепш, чым у мінулым годзе, праведзена праполка і ўборка. Колгасы як правіла, праполку гароду, лёну і абворваньне бульбы правялі своячасова. Значна лепш было сёлета праведзена і ўборка ўраджаю. Асабліва трэба адзначыць пасьпяховае правядзеньне ўборкі лёну.

Але ўсё-ж, ня гледзячы на гэтыя посьпехі, нельга сказаць, што барацьба за ахову ўрджаю праводзіцца здавальняюча. У Дзяржынскім раёне ў выніку несваячасовай уборкі з поля ў радзе калгасаў парасло жыта (калгас «Штурмавік», імя Тэльмана і г. д.). Таксама шмат страт панесьлі цэлы рад калгасаў Капыльскага раёну.

Мы маем вялізарныя магчымасьці павялічэньня працэнту ў калгасе. Там, дзе гэтыя магчымасьці выкарыстоўваюцца, атрымліваюцца бліскучыя посьпехі. Варта спыніцца на рабоце камуны «Праца» (Ельскі раён), якая здолела атрымаць з га 1800 пуд бульбы, або калгас «Набат», які атрымаў з га 26 цэнтр ячменю і 15 цэнтр. з га пшаніцы.

Уся справа ў тым, каб дасягненьні паасобных калгасаў папулярызаваць, перанесьці вопыт гэтых калгасаў у барацьбе за ўраджай ва ўсе адстаючыя саўгасы і калгасы.

На працягу дзекады калектывізацыі і ўраджаю трэба папулярызаваць работу лепшых калгасаў. Неабходна арганізаваць выстаўкі, наладзіць гутаркі, лекцыі аб тым, як той ці іншы калгас дамогся посьпехаў у павышэньні ўраджайнасьці; трэба дэталёва абгаварыць і выявіць у кожным калгасе прычыны зьніжэньня ўраджайнасьці, якія меры трэба ўжыць, каб дабіцца пераломy.

Падагульваючы гэтыя вынікі, калгасы павінны ўжо разгарнуць падрыхтоўку да веснавой сяўбы 1933 г. Трэба ўжо прыступіць да абгаварэньня тыповых севазваротаў, ссыпаць насенныя фонды, рамантаваць інвэнтар і г. д. Пры масавай мабілізацыі ўвагі калгасьнікаў вакол павышэньня ўраджайнасьці мы павінны і зможам дамагчыся рашучага пераломy ў бліжэйшы час на гэтым адказьнейшым вучастку работы.

А. Вайцок.

З ДАКУМЭНТАЎ КАСТРЫЧНІКА



ОБЪЯВЛЕНІЕ
...ющаго войсками Петроградскаго военнаго Округа.

Чтобы ...

Предлагаю населению Петрограда, что какое-нибудь ...

...

Г. ЛЕБЕДЗЕЎ, член Калегіі НКЛП

Заваёвы лёгкай прамысловасьці СССР за 15 год

У той час, як у капіталістычных краінах эканамічнае становішча характарызуецца рэзкім скарачэньнем вытворчасьці, дзесяткамі мільёнаў беспрацоўных і нябывалай галечай працоўных мас Савецкі саюз у XV гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі падводзіць вынікі вялізарных посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Яшчэ у 1931 г. фактычны аб'ём ўсёй прамысловай прадукцыі СССР перавышаў узровень 1913 г. амаль у тры разы, тады як вытворчасьць Англіі і Германіі ўпала да 85 проц. ад даваеннага ўзроўню. У бягучым годзе параўнаўча з сярэдзінай 1929 г., моманту найвышэйшага росквіту капіталістычнай гаспадаркі, сусьветная прамысловая прадукцыя скарацілася у сярэднім на 40 проц., прычым найбольшае скарачэньне вытворчасьці мае месца па такіх высока разьвітых капіталістычных краінах, як Францыя і ПАЗШ. Тэкстыльная прамысловасьць капіталістычных краін скарацілася сваю вытворчасьць у параўнаньні з 1928 г. на 15 проц. Аднак у паасобных краінах па радзе галін лёгкай індустрыі наглядаецца рэзкае падзенне выпуску прадукцыі.

Ва Францыі тэкстыльная прамысловасьць скарацілася на 50 проц. у параўнаньні з 1913 г., у ПАЗШ у маі бягучага году тэкстыльная прамысловасьць складала 60 проц. і скурана-абутковая—79 проц. у параўнаньні з 1923—25 г. г. У Германіі ў чэрвені тэкстыльная прамысловасьць скарацілася да 74,8 проц. і абутковая да 89,6 проц. у параўнаньні з 1928 г.

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва СССР за апошнія гады; рэканструкцыя ўсёй народнай гаспадаркі забясьпечылі неабходныя ўмовы ў справе разьвіцьця нашай лёгкай прамысловасьці. Да XV гадавіны мы адзначаем значныя посьпехі Савецкага саюзу ня толькі ў справе стварэньня моцнай цяжкай індустрыі, але і ў разьвіцьці лёгкай прамысловасьці, задавальняючай патрэбамі сваёй вытворчасьці спажывецкія патрэбы шырокіх слаёў працоўных мас. Толькі за апошнія 4 гады ўся лёгкая прамысловасьць Саюзу павялічыла свой выраб амаль у два разы. Валавая прадукцыя, якая складала ў 1928 годзе 4.961 мільён рублёў, павінна па пляну на 1932 г. скласьці 9.840 мільёнаў руб. За 15 год рэвалюцыі лёгкая прамысловасьць па каштоўнасьці выпускаемай ёю прадукцыі дала павялічэньне ў параўнаньні з 1913 г. амаль у тры разы (283,9 проц.).

Усе прыведзеныя даныя дастаткова яскрава ілюструюць вялізныя дасягненьні Савецкага саюзу ў справе індустрыялізацыі краіны і непарапыннага палепшаньня культурна-матар'яльнага становішча рабочай клясы і калгаснага сялянства.

За гады рэканструкцыйнага пэрыяду значна ўзрасьлі і галіны прамысловасьці, якія ў дарэвалюцыйны час знаходзіліся ў паўпачатковым становішчы. Амаль заново створана буйная швэйная прамысловасьць, прадукцыя якой у 1932 г. у 150 разоў перавышае фабрычную прадукцыю 1913 году. Валавая прадукцыя трыкатажнай прамысловасьці з 17,8 мільёнаў у 1913 г. павялічваецца да 566,6 мільёнаў руб. у 1932 г. ці больш чым у 30 разоў. Скурана-абутковая прамысловасьць у цэлым дала павялічэньне ў 6 разоў у параўнаньні з 1913 г., прычым фабрычны выраб абутку павялічыўся ў 10 разоў, выраб мыла даў павялічэньне ў 4 разы, запалак — у 2,5 разоў і г. д. Побач з гэтым за апошнія гады створаны заново цэлыя галіны, каталкана, катанінная, скурана—сурагатная, выраб канцтавараў, выраб навукова-наглядных дапаможнікаў, фота-хімічная прамысловасьць, кінапрамысловасьць, выраб кіна-апаратуры, музыкальная прамысловасьць і цэлы рад новай вытворчасьці.

Прадукцыя гэтых новых галін прамысловасьці ўжо да гэтага часу вылічаецца сотнямі мільёнаў рублёў.

Разьвіцьцё лёгкай прамысловасьці ў царскай Расіі вытваралася пераважна на пад уплывам замежнага капіталу. З прычыны гэтага амаль усе галіны прамысловасьці знаходзіліся ў вялікай залежнасьці ад заграніцы. Штогод ў Расію ўвозілася на сотні мільёнаў рублёў абсталяваньня, прамысловай сыравіны, а таксама гатовых выробаў лёгкай прамысловасьці. Так, напрыклад, усё абсталяваньне для тэкстыльнай прамысловасьці ўвозілася з-за граніцы і неабходная для яе сыравіна была таксама пераважна загранічнага паходжаньня. Амаль па ўсіх дапаможных матар'ялах, якія ўжываюцца лёгкай прамысловасьцю, мы таксама цалкам залежылі ад заграніцы, як напрыклад, па афарбавальніках і ўсякіх матар'ялах, што ідуць для патрэб тэкстыльнай прамысловасьці.

Вядома гэта залежнасьць не магла быць ліквідавана ў кароткі тэрмін. Але ўжо XIV зьезд партыі даў дырэктыву аб вызваленьні СССР ад іншакраінпай залежнасьці. Да гэтага часу нам удалося арганізаваць уласнае тэкстыльнае машынабудаўніцтва і цэлы рад новых вытворчасьцяй, якія выробляюць пасобныя дэталі падсобныя матар'ялы, афарбавальнікі і г. д. для галін лёгкай прамысловасьці.

Адным з найбольш буйных дасягненьняў Савецкага саюзу ў адносінах лёгкай прамысловасьці зьяўляецца стварэньне ўласнай базы сыравіны за гады рэканструкцыйнага пэрыяду. Гэта дазволіла нам да гэтага часу амаль поўнасьцю вызваліцца ад імпарту сыравіны. Мы дабіліся рашаючых посьпехаў у справе павялічэньня выробу сельска-гаспадарчых тэхнічных культур, у прыватнасьці пашырэньня пасеваў бавоўны, лёну пянькі і г. д.

Пасеўная плошча пад бавоўнай з 688 тыс. га ў 1913 г. павялічылася да 2.085 тыс. га ў 1932 г. ці на 203 проц. пасеўная плошча пад лёнам з 1930 тыс. га павялічылася да 2500 тыс. га, ці на 30 проц., пад канаплямі з—721 тыс. га да 933 тыс. га, ці на 29,4 проц.

Разам з гэтым апошнія гады характарызуюцца вялікімі дасягненьнямі лёгкай прамысловасьці ў адносінах скарыстаньня новых відаў сыравіны, як напрыклад, ужываньня ў вытворчасьці скураных вырабаў сьвіных скур, скур сабак, морскага зьвера, рыбных і г. д., шырокім ўжываньнем усякага роду сурагатаў у скуранай, шарсьцяной прамысловасьці і г. д.

У справе стварэньня ўласнай сыравінай базы неабходна адзначыць апрача пашырэньня пасеваў тэхнічных культур вялікія дасягненьні ў адносінах арганізацыі зусім новых галін прамысловасьці.

Катанінная прамысловасьць і прамысловасьць штучнага валакна зьяўляюцца значным рэзэрвам для палаўненьня сыравінных рэсурсаў тэкстыльнай прамысловасьці. На колькі вялікае значэньне ўноў створанага выробу сурагатаў скуры можна бачыць хоць-бы з таго, што ў 1931 г. удзельная вага сурагатаў, ужываемых пры вырабе абутку, складала 15,3 проц., у 1932 г.—43,4 проц. і ў 1933 г. павінна скласьці 48,2 проц. Такім чынам палова абутку ў будучым годзе павінна быць зроблена з ўжываньнем скураных сурагатаў узамен дэфіцытнай натуральнай скуры.

У рэзультаце стварэньня ўласнай сыравінай базы лёгкая прамысловасьць у цяперашні час амаль зусім вызвалілася ад імпарту.

Калі ў 1927—28 г. г. у СССР увозілася бавоўны на 150 мільёнаў руб. золатам, дык у 1932 г. мы зусім вызваліліся ад імпарту. Увоз шэрсьці які складаў ў 1927—28 г. 65 мільёнаў руб., і ўвоз цяжкай скуранай сыравіны—136 мільёнаў руб., у бягучым годзе спынен амаль зусім; увоз дубіцеляў, патрэбных для скуранай прамысловасьці, складаў ў 1927-28 г. 15 мільёнаў руб.; у 1932 г. таксама спынены.

Неабходна падкрэсьліць, што ў 1932 год лёгкая прамысловасьць рашучым чынам стала на шлях вызваленьня ад імпарту ня толькі ў адносінах сыравіны, але і ў адносінах усякіх дэталяй, дапаможных матар'ялаў і абсталяваньня. Увоз абсталяваньня для галін лёгкай прамысловасьці, які складаў ў 1927-28 г. 23 мільёны руб., у 1931 г. быў даведзены да 600 тыс. р. і ў 1932 г. спынены зусім.

У галіне арганізацыі новых вытворчасьцяй у лёгкай прамысловасьці мы маем вялікія дасягненьні, што выявіліся ў пастаноўцы вытворчасьцяй, якія загатаўлялі пераважна прадметы прамысловага спажываньня і ўвозіліся раней з-за граніцы і ішлі галоўным чынам для раду галін цяжкай прамысловасьці. У прыватнасьці па шарсьцяной прамысловасьці арганізаваны выраб тэхнічнага сукна, якое раней цалкам увозілася з-за граніцы кожны год на суму каля 1.500 тыс. руб. золатам. Па бавоўнина-папяровай прамысловасьці пастаўлен выраб высокіх нумароў пражы з уласнай бавоўным, арганізаваны выраб аўтакарду, палат на для снопавязалак і г. д.

Па ільняной прамысловасьці асвоены новыя машыны па вырабе дратвенай ніткі, якую да самага апошняга часу мы прывозілі з-за граніцы кожны год на суму каля 1 мільёну р. золатам. Па пенька-джутавай прамысловасьці пастаўлены выраб снопавязальнага шпагату, якога ў 1930 г. было ўвезена на суму 3.600 тыс. руб. і ў 1931 г. на 2 мільёны руб. Цэлы рад дасягненьняў мы маем і па іншых галінах лёгкай прамысловасьці.

Арганізаваны рад падсобных вытворчасьцяй, якія абслугоўваюць тэкстыльную прамысловасьць, і якія выпускаюць вырабы, што раней не выпрабляліся ўнутры краіны. У цяперашні час поўнасьцю пакрываецца ўся патрэба тэкстыльнай прамысловасьці ў кардаістужцы ў кардакапялюшох, у чаўнаках, у ланцугох Галя і г. д., асвоен ў значнай частцы выраб трыкатажных іголак, якія штогод увозілі ся з-за граніцы на суму каля 1 мільёну руб. Штогодны імпарт на падсобных матар'ялах складаў каля 8 мільёнаў руб.

У скурана-абутковай прамысловасьці арганізаваны выраб шаўра

ЗА ГРАНІЦАЙ

Бурныя дэманстрацыі студэнтаў па ўсей Польшчы

ВАРШАВА. 27-X. Сёньня на вуліцах Варшавы адбыліся бурныя студэнцкія дэманстрацыі ў адзнаку пратесту супроць павышэньня платы за вучэньне. У двары ўнівэрсытэту сабраўся шматлісьлічны натоўп студэнтаў і, ня глядзячы на забарону ўлады, рушыўся да будынку міністэрства асьветы. У часе дэманстрацыі раздаваліся лёзунгі: «Да лоў урад, дайце нам магчымасьць вучыцца».

Адбыліся заўзятыя сутычкі з паліцыяй, якая пусьціла ў ход усе прылады вулічнай барацьбы. Спэцыяльны танк абліваў натоўп моцным струменем вады. З мэтаю разгону мітынгу, перад будынкам міністэрства асьветы паліцыя кінула некалькі сьлёзатачывых бомб. Студэнты аказалі супраціўленьне. У сутычках некалькі паліцэйскіх і вялікая колькасьць студэнтаў па ранены. Паліцыяй учынены шматлікія арышты.

***

ВАРШАВА. 29-X. Бурныя дэманстрацыі студэнтаў адбыліся 27 кастрычніка таксама і ў Вільні, Львове і Познані. Газэты паведамляюць, што на мітынгу перад будынкам Львоўскага ўнівэрсытэту выступіў камуністычны прамоўца, пры гэтым распаўсюджваліся ў вялікай колькасьці рэвалюцыйныя лістоўкі.

Паводле паведамленьня газэт, усюды адначасова прыняты рэзалюцыі пра абвяшчэньне ўсеагульнай забастоўкі студэнтаў. Забаставалі студэнты ўнівэрсытэту ў Познані. Студэнцкія пікеты не прапускаюць нікога ва ўнівэрсытэт.

„Вешаць няма каму“

ВАРШАВА. 28 кастрычніка. (Уласн. інф. «Праўды»). З усіх канцоў Польшчы паведамляюць аб узмоцненай дзейнасьці палявых судоў. Няма таго дню, каб ня было пабудавана некалькі новых шыбеніц для рэвалюцыйных рабочых і сялян, асабліва на Зах. Украіне і ў Зах. Беларусі.

«Ілюстраваны кур'ер цодзённы» ад 23 кастрычніка паведамляе, што ў Роўні паводле прыгавору палявога суду павешаны абвінавачаныя ў «шпіёнажы» 4 рабочыя: Пётра Раманюк, браты Леанід і Фёдар Іванчук, Алесь Гофман.

Газэта «Полонія» ад 21 кастрычніка паведамляе, што ў Пінску павешаны па абвінавачваньні ва ўдзеле ў партызанскім атрадзе селянін Ян Краўчук. У Ковелі павешаны асуджаны палявым судом за ўдзел у партызанскім руху селянін Вегера Ўласт.

У сувязі з усё больш частымі сьмяротнымі прыгаворамі, якія выносяцца палявымі судамі, кат ня можа справіцца, і ў радзе выпадкаў павешаньні праводзяцца менш спрактыкаванымі памочнікамі ката. Орган хрысьціянскіх дэмакратаў «Полонія» абураны няўменьнем гэтых памочнікаў. У нумары ад 22 кастрычніка гэта каталіцкая газэта пад загалоўкам «Вешаць няма каму» зьмяшчае заметку, ў якой патрабуе павялічэньня штату ката ў для таго, каб «вешаньнем не займаліся выпадковыя аматары».

Прычынай да зьмяшчэньня гэтай заметкі паслужыў той факт, што ў часе адной з экзэкуцый, утворанай у Варшаве адным з такіх «выпадковых аматараў», асуджаны вісеў жывы ў пятлі на працягу 15 мінут.

Дыскусія над „канструкцыйным плянам“ у Францускім парламанце

ПАРЫЖ. 30-X. Агенцтва «Гавас» паведамляе: «Дыскусія ў парламанце з прычыны канструкцыйнага пляну раззбраеньня адбывалася ў прысутнасьці большасьці дэпутатаў і міністраў. Пасьля выступленьня сацыяліста Леона Блюма і ў адказ яму выступленьня Эрыё, — Блюм, які ізноў выступіў, выказаў пажаданьне, каб францускі плян раззбраеньня і бясьпекі аб'яднаў навакол Францыі іншыя дзяржавы і выклікаў энтузіязм народаў. «Тады, — казаў Блюм,—адмаўленьне Германіі далучыцца да гэтага пляну выклікала-бы аднагодны адпор супроць фэўдальных тэндэнцый. Неабходна, заканчваў Блюм — не да пусьціць узбраеньняў Германіі».

Выступіўшы Франклен Буйен, заявіў, што Германія заўсёды парушала Вэрсальскі дагавор і зачытаў дакумэнт, які ўстанаўліває, што Германія хавае ваенны матар'ял і пералічвае ўсе выпадкі ўхіленьня Германіі ад кантролю над узбраеньнямі. Буйен крытыкаваў пазіцыю Макданальда ў 1914 годзе, як антыфранцускую. Гэтая крытыка выклікала найжывейшы протэст з боку Эрыё, які адказаў, што Франклен Буйён выступіў з несправядлівымі і неасьцярожнымі заявамі ў момант, калі адбываюцца складаныя міжнародныя перагаворы. Эрыё пры гэтым выказаў сваю шчырую і глыбокую падзяку Англіі.

Працятваючы сваю прамову, Буйён заявіў, што для Францыі бескарысна ісьці шляхам раззбраеньня ў той час, як Германія парушала ўсе ўзятыя на сябе абавязацельствы і зазначыў на неабходнасьць папярэдня зрабіць міжнароднае абсьледваньне германскіх узбраеньняў.

Адказваючы на пытаньне, — Эрыё адзначыў, што зроблена несправядлівасьць у адносінах да Францыі, краіны, якая ў найбольшай ступені раззброіла сябе, пачынаючы з 1919 году «Патрабаваньне роўнасьці ў правах у тым выглядзе, у якім яно было высунута Германіяй, — сказаў Эрыё,—азначае патрабаваньне ўзбраеньня. Узбраеньне адпаведае канцэпцыям фон-Сэкта і германскага генэральнага штабу. Калі Жэнэўская канфэрэнцыя пацерпіць няўдачу, гэта будзе азначаць ня толькі аднаўленьне саперніцтва ва ўзбраеньні паміж Францыяй і Германіяй, але і аднаўленьне груповак дзяржаў. Мы павінны захаваць спакой іменна за тым, што становішча гэткае сур'ёзнае»

Эрыё ў асноўных рысах пазнаёміў палату з францускім плянам раззбраеньня і бясьпекі, які кваліфікаваў як «пакт, што забясьпечвае максымум бясьпекі».

Перадвыбарчыя мітынгі кампартыі Германіі

БЭРЛІН. 30-X. 28 кастрычніка ў Бэрліне адбылося 16 перадвыбарчых мітынгаў, арганізаваных кампартыяй. Мітынг пралетарскіх жанчын быў забаронены. На мітынзе беспрацоўных дакладчык быў арыштаваны, а мітынг разагнаны. У знак пратэсту супроць разгону мітынгу беспрацоўныя налядзілі дэманстрацыю, якая была разагнана паліцыяй.

Учора і трэцяга дня ў правінцыі ад быўся цэлы рад перадвыбарчых мітынгаў кампартыі, на якіх выступалі тт. Пік, Рэмеле, Мюнцэнберг, Гектар ды інш

„Няпрыймальна ні для аднаго германскага ўраду“

БЭРЛІН. 30-X. Орган колаў блізкіх да ваеннага міністэрства «Тэглішэ Гундшау» публікуе артыкул накіраваны супроць праэкту Эрыё пад загалоўкам: «Няпрыймальна ні для аднаго германскага ўраду». Газэта прыходзіць да наступнага выводу:

«Праэкт Эрыё становіць сабой сваёбольны плян усіх францускіх канцэпцый, накіраваных да зрыву бясьпекі, якія, само-сабой зразумела, вядуць да ўвекавечваньня эўропейскай сыстэмы 1919 году, створанай Францыяй: Усякі германскі ўрад павінен адхіліць падобны плян»

Па думцы газэты, ваенна-тэхнічная частка праэкту Эрыё матывуецца наўмысная неяскравасьцю. Плян Эрыё не дае яскравага адказу на пытаньне аб роўнасьці ва ўзброеньнях, чаму таксама і ўсе другія пункты пляну Эрыё ня могуць служыць пляцформай згоды па раззбраеньні

Кітайская Чырвоная армія падыходзіць да Фуцзяню

ШАНХАЙ. 29-X. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго, Кітайская Чырвоная армія падыходзіць да правінцыі Фуцзянь.

У паведамленьні гаворыцца, што «павялічаныя сілы чырвоных, сканцэнтраваныя ў правінцыі Цзянсі, значна прасунуліся наперад у паўночна-ўсходнім кірунку, заняўшы тэрыторыі вакол Шаньчана і Цзяньяна» (на паўночным захадзе Фуцзяня).

***

ШАНХАЙ. 30-X. Паводле паведамленьня агенцтва «Юнайтэд Прэс» Кітайская Чырвоная армія разьвівае энэргічныя апэрацыі на граніцы правінцыі Фуцзян і Цзянсі. Рад пунктаў, уключаючы і Цзяньле, захоплены Чырвонай арміяй, якая зараз пагражае Цзяньніну. У правінцыю Янцзы ў дадамогу Чырвонай арміі працягваюць прыбываць новыя падмацаваньні.

Кантонская ўлада вядзе перагаворы з 19 арміяй аб сумесным выступленьні супроць Кітайскай Чырвонай арміі, якая апэруе на граніцы правінцыі Цзяньсі і Гуаньдунь.

Сяянскія хваляваньні ў Янчжоу

ШАНХАЙ. 30-X. Хваляваньні сярод сялян у павеце Янчжоу (правінцыя Цзянсу) аднавіліся пасьля таго, як сяляне даведаліся аб адмове мясцовых уладаў аслабаніць падпалышчыкаў руху супроць уплаты падаткаў. Сяляне атакавалі нават мясцовых чыноўнікаў і зноў спрабавалі прайсьці ў межы горада, які абкружаны сыцяной і ахоўваецца войскам. Хваляваньнямі ахопле на 10 паветаў правінцыі.

Канцэнтрацыя японскага войска на мяжы правінцыі Жэхэ

ШАНХАЙ. 30-X. Над Кайшу (ў паўночна-ўсходняй частцы Жэхэ) зьявілася 5 самалётаў, якія скінулі 20 бомб. Японцы канцэнтруюць на ўсходняй мяжы ўнутранай Манголіі 60.000 мангольскага войска і адну дывізію японскага, а таксама паветраную флётылію ў складзе 15 самалётаў. Гэтая канцэнтрацыя войска зьяўляецца па думцы кіраўнікоў ураду Жэхэ, падрыхтоўкай да ўварваньня ў Жэхэ.

Японская ваеншчына ня мае надзеі на хуткую ліквідацыю партызанскага руху ў Манчжурыі

ТОКІЕ. 30-X. Парламанцкі дарадчык ваеннага міністэрства — член партыі Сэйюкай—Ішыі, які вярнуўся з аб'езду па Манчжурыі, ў інтэрвію заявіў, што «прыдушэньне бандытызму ў Манчжурыі зойме ня менш двух-трох год». Гэтая задача, па думцы Ішыі, «катэгарычна патрабуе дадатковай ад праўкі 5 японскіх дывізій у Манчжурыю».

Курс іены падае нясупынна

ТОКІЕ. 28-X. Сёньня ранцою курс іены паў да 21¾ даляра за 100 іен (на пачатку курс іены каля 60 даляраў за 100 іен). Агенцтва «Сімбун-Рэнго» тлумачыць гэтае падзеньне ціскам шанхайскіх банкаў, якія пачалі продаж іены ў вялікай колькасьці.

Сапраўдныя-ж прычыны рэзкага падзеньня заключаюцца ва ўзмоцненай інфляцыі, у няспрыяючых пэрспэктывах замежнага гандлю і ў пагоршаньні міжнароднага становішча Японіі, выкліканага манчжурскім пытаньнем, якое, міжнародн. становішча Японіі, як чакаюць, яшчэ больш пагоршыцца ў лістападзе, пасьля паседжаньня Ліг на цый.

Польшча нацыскае на Данцыг

ВАРШАВА. 30-X. Як ужо паведамлялася, польскі ўрад патрабаваў ад данцыгскага сэнату перагляду варшаўскай згоды па пытаньні аб прыёме на данцыгскую службу нямецкіх чыноўнікаў у мэтах палянізацыі данцыгскіх устаноў. Следам за гэтай нотай пасьледвала пастанова польскага ўраду аб абавязковасьці разьлікаў па ўсіх чыгуначных фрахтах на грузы, якія ідуць з Данцыгу выключна ў польскай валюце. Гэтым мерапрыемствам польскі ўрад наносіць удар фінансам Данцыгу.

Учора апублікаваны дэкрэт прэзыдэнта аб тэрытарыяльных водах Польшчы. На падставе таго, што Данцыг уваходзіць у мытную сыстэму Польшчы, дэкрэт прэзыдэнта ўстанаўляе, што «узьбярэжныя воды Данцыгу» шырынёю ў 6 морскіх міль падпадаюць пад кантроль польскіх мытных уладаў. Новы дэкрэт азначае ўзмацненьне мытнага націску на Данцыг з боку Польшчы

„Адзіны выхад— зблiжэньне з СССР“

ВАРШАВА. 30-X. «Газэта Варшаўска» зьвяртае ўвагу на артыкул Пфэйпэра ў газэце «Ля Рэспублік». Пфэйпер паводле слоў газэты, лічыць, што для Францыі існуюць тры магчымых палітычных шляхі: праз згоду з Германіяй, праз згоду з Італіяй або праз згоду з СССР».

«Газэта Варшаўска» выказвае надзею, што першыя два шляхі хутка вывядуць поўную сваю нерэальнасьць. «Шпаркімі крокамі надыходзіць час, калі страцяцца надзеі на магчымасьць захаваньня міру ў Эўропе шляхам жэнэўскіх гарантый. Хутка вывядуць сваю нерэальнасьць таксама ідэя Брыяна ад дасягненьні кампрамісу з Германіяй любой цаной. Тады застаецца адзіны выхад—пошукі шляхоў зблiжэньня з Італіяй і СССР».

Дэманстрацыі англійскіх беспрацоўных па ўсёй краіне

ЛЕНДАН. 30-X. У час дэмонстрацыі беспрацоўных у лёнданскім Гайдпарку паранена 65 чалавек, сярод іх трое паліцэйскіх. Учынена 14 арыштаў. Нацыянальны дзень барацьбы супроць беспрацоўя праведзены па ўсёй Англіі. У многіх гарадох Шатландыі былі арганізаваны шматлікія дэманстрацыі. У Глазго ў дэманстрацыі прымала ўдзел 10.000 беспрацоўных, якія спрабавалі паслаць дэлегацыю ў муніцыпалітэт, але сотні паліцэйскіх перагарадзілі ім доступ да будынку муніцыпалітэту.

У Кодбрыджы на шматлюдную дэманстрацыю беспрацоўных напалі паліцэйскія, якія паранілі 5 чалавек дэманстрантаў. Учынена 10 арыштаў. У Дэньдзі ў дэманстрацыі прынялі ўдзел некалькі тысяч чалавек.

„Бальшавік“ працуе над сваёй пяцігодкай

Масавы ўдзел рабочых у прапрацоўцы пляну другой пяцігодкі—парука яго рэальнасьці. У працэсе пляніраваньня былі выпадкі, калі нерэальнасьць праграмы зьяўлялася іменна прычынай габінэтнай яе апрацоўкі, прапрацоўкі без актыўнага ўдзелу шырокіх мас.

Вопыт прапрацоўкі заводзкіх пяцігодак незвычайна каштоўны хоць-бы тым, што плянавыя намёткі праходзяць праз фільтр рабочага кантролю. Вопыт чырвонаштандарнага скуразводу «Бальшавік» (Менск) паказвае, наколькі каштоўна гэта мерапрыемства ня толькі ў адносінах гэтага «фільтру», а і ў адносінах іншых ня менш важных фактаў.

Для масавай прапрацоўкі пляну заводзкай пяцігодкі на заводзе была вылучана ЧКК з прадстаўнікоў рабочых, ІТР, парткалектыву і заўкому Работа гэтай ЧКК заслугоўвае асаблівай увагі, бо яна фактычна і кіравала масавай прапрацоўкай пляну.

Усе члены ЧКК былі прымацаваны для кіраўніцтва прапрацоўкай да цэхаў Кожны член ЧКК узначальваў і адказваў за прапрацоўку пляну ня толькі ў цэху, але і ў брыгадзе. На дапамогу членом ЧКК увесь адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал быў разьмеркаваны па брыгадах. У рабочым пляне ЧКК мы знаходзім такія запісы:

«У першым фармовым цэху ў брыгадзе намазчыкаў ад ІТР—Андрэйскі, прафорг—Зарамбоўскі, месца збору—сталоўка».

Такім чынам створаныя 37 брыгад з ІТР, прафоргаў і членаў ЧКК ахапілі ўвесь завод падрабязнай і глыбокай прапрацоўкай пляну.

Пачалася брыгадная прапрацоўка ўжо пасьля папярэдняга пашыранага паседжаньня заводзкага камітэту і гутарак па цэхах аб будучай рабоце. Трэба сказаць, што цэхавыя брыгады не пачалі сваёй работы да таго часу, пакуль ІТР і агульны сход ІТР глыбока не прапрацавалі плян.

З якімі матар'ялямі знаёміліся брыгады ў цэхах?

Заводзкая шматтыражка выпускае спэцыяльны нумар газэты з установкай:

— Падрыхтуемся да сустрэчы і бальшавіцкага выкананьня пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадства.

— Плян павінен выявіць усе магчымасьці нашага заводу.

— Улічыць рацыяналізатарскі і вынаходніцкі фух.

— Рэальнасьць пляну залежыць ад масавай прапрацоўкі.

Спэцыяльны бюлетэнь ЧКК і шматтыражка друкуюць тэмнік па масавай прапрацоўцы пляну. У ім мы знаходзім матар'ялы: аб выпуску прадукцыі ў апоечных адзінках, выпуск клею ў тонах, выпуск прадукцыі ў каштоўным выражэньні, капітальнае будаўніцтва і пашырэньне, рахункам абсталяваньня, камунальна-жылыёвае будаўніцтва і г. д.

Прычым перад брыгадамі было пастаўлена 11 патрабаваньняў. У гэтых патрабаваньнях сваяасаблівы плян, па якім ідзе абгаварэньне і прапрацоўка пляну—праекту другога пяцігодзьдзя ў брыгадах.

Вось чны:

1. Выяўленьне поўнай вытворчай магутнасьці кожнага цэху і ўсяго абсталяваньня пры 3-х зьменнай рабоце.

2. Пры якіх умовах тэхнічнай рэканструкцыі (пабудова новых цэхаў, дабарудваньне навейшымі станкамі) магчымы рост прадукцыі.

3. Магчымасьці ў выпуску прадукцыі і асартыменту.

4. Мэханізацыя працы і рацыяналізацыя вытворчых працэсаў.

5. Прапрацоўка пытаньняў арганізацыі працы, ліквідацыя абязьлічкі і правільная расстаноўка рабочай сілы.

6. Поўнае выяўленьне магчымага росту прадукцыйнасьці працы на гадох да апошняга году пяцігодкі.

7. На вопыце работы лепшых гаспадарча-разьлікових і ўдарных брыгад вывесьці канкрэтныя мерапрыемствы па зьніжэньні сабекошту.

8. Шырока абгаварыць пытаньне арганізацыі на заводзе новых вытворчасьцяй, якія вызваляюць СССР ад эканамічнай залежнасьці ад капіталістычных краін.

9. Абгаварыць мэтады ўсваеньня ўласных відаў сыравіны і матар'ялаў з лепшай утылізацыяй адкідаў і адыходаў вытворчасьці.

10. Прапрацоўка пляну па тэхніцы бясьпекі, охова працы і аздаравіцельных мерапрыемстваў кожнага цэху і ўсяго заводу.

11. Арганізацыя масавага збору прапаноў рабочых і ІТР у фонд другой пяцігодкі па ўсіх пытаньнях работы заводу.

Што-жа ў выніку гэтай работы атрымалася? У якім выглядзе быў прадстаўлены плян цэхавай вытворчай нарадай, а пазьней агульна-гарадзкой канфэрэнцыяй?

У якасьці адказу падамо выпіскі прапрацоўкі па некаторых брыгадах:

Брыгада габляроў і фарбаўшчыкоў другога храмовага цэху ўнесьлі 22 рацыяналізатарскія прапановы.

Праграму гэбляваньня магчыма і трэба павялічыць пры ўмове мэханізацыі падачы скур.

— Мы выкарыстоўваем лішнюю электраэнэргію. Маторы трэба ўстанавіць да кожнага габлярнага станку.

Або дробязь. Аблегчыць крышкі да барабанаў. Здаецца «дробязь», а гэта эканоміць сілу рабочага, паскарае работу.

Або іншае:

Калі ў існуючых габлярных станках замяніць нажавыя валы большымі—прадукцыйнасьць значна павялічаецца.

Кожная брыгада (а іх 37) сваімі рацыяналізатарскімі прапановамі зьмяняла плян па капітальных затратах і ў выніку перакройваліся сумы, зьмяняліся тэрміны, сьпісы абсталяваньня.

Коратка гаворачы, калі паводле пярэдняга пляну практыка магутнасьць новага хромавага цэху прыставляла 5018 сьвіных скур у дзень, дык пасьля прапрацоўкі яго ў брыгадах вывялася магчымасьць давядзець ня выпрацоўкі да 7 тыс.

У выніку праведзенай работы выявілася неабходнасьць пабудовы спэцыяльнага ўтыльцэху, які здолеў-бы перапрацаваць усе адыходы 3-х хромавых цэхаў заводу.

Або пытаньне аб раскроі: раскройваць тавар непасрэдна на заводзе,—значыць дасягнуць большай эканомі ў верхнім тавары і скарыстаць адыходы раскрою поўнасьцю.

Коратка гаворачы, за час прапрацоўкі заводзкай пяцігодкі паступіла 45 каштоўных прапаноў у фонд другога пяцігодзьдзя.

Намазчыкі другога хромавага цэху ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва высунулі суперэны па колькаснай выпрацоўцы (110 проц.) Тое-ж самае зрабілі брыгады лапчыльшчыкаў, разьбіўшчыкаў, праўшчыкаў, варшчыкаў і г. д.

Каштоўнае ў вопыце «Бальшавіка» тое, што ў прапрацоўцы пляну быў ахоплены ўвесь заводзкі калектыў. Гэта магло быць дасягнута іменна таму, што асноўны ўпор у прапрацоўцы быў зроблены ў брыгадзе. Цэхавыя вытворчыя нарады эканомілі работу брыгад. Нарады ІТР падрыхтоўвалі матар'ялы для брыгад, а агульна-заводзкая канфэрэнцыя падводзіла вынікі прапрацоўкі пляну па ўсім заводзе.

Была спроба з боку калектыву «Бальшавіка» перакінуць вопыт сваёй працы на іншыя прадпрыемствы БССР. Іменна спроба, бо гэтая работа ня была даведзена да канца...

Агульна - гарадзкая канфэрэнцыя «Бальшавіка» прапанавала правесьці перакліч прадпрыемстваў па пытаньні ходу барацьбы за выкананьне пляну 4-га заключнага і лепшай падрыхтоўкі да ўступленьня ў другую пяцігодку. Аднак гэтая прапанова, нажаль, ня была падхоплена прадпрыемствамі БССР.

Вопыт «Бальшавіка», бязумоўна, заслугоўвае ўвагі. Задача заключаецца ў тым, каб перакінуць гэты вопыт на іншыя прадпрыемствы БССР, каб прызьвіў чырвонаштандарнага заводу аб перакліччы быў падхоплены.

На міжраённым мірмашу у Менску—ларкі Сампромкоопэрацыі.

У падарунак ХУ гадавіне Кастрычніка—нова-пабудаваны хлебазавод

БАРЫСАЎ. Да кастрычніцкіх сьвят уступае ў строй нова - пабудаваны хлебазавод з магутнасьцю выпечкі хлеба ў 50 тон у дзень. Канчаецца будаўніцтва 18-кватэрнага дому і пабудова лазьні.

Да дню ХУ гадавіны рабочыя Барысаўшчыны атрымваюць яшчэ адну перамогу на фронце культурнага будаўніцтва — ў дні сьвят пачне працаваць нова пабудаванае гукавое кіно. (БЕЛТА).

Новая мэханічная пральня

Адрамантаваны і забясьпечаны па лівам усе лазьні г. Менску. У цэнтральнай лазьні адкрыта цырульня

Пашыраюцца ўсе захады для таго, каб да 7-га лістапада пусьціць у эксплёатацыю мэханічную пральню будаўніцтва якой у асноўным скончана.

Для прэм'яваньня лепшых ударнікаў будаўніцтва вылучаны прэм'яльны фонд у суме 1700 рублёў.

(Белта).

Хроніка

▲ У дні сьвяткаваньня ХУ гадавіны Кастрычніка ў Віцебску адкрываюцца завод па вырабе стандартных дамоў і сталоўкі пры фабрыцы «Сьцяг Індустрыялізацыі» і Вэтэрынарным інстытуце. Да гэтага часу заканчваецца пабудова раду дамоў для рабочых.

▲ У Гомель консультант маскоўскага парку культуры і адпачынку, які разам з прадстаўнікамі відовішчных прадпрыемстваў распрацуе плян работы Гомельскага парку культуры і адпачынку на 1932-33 год і зробіць яго перапляніроўку.

▲ У мэтах падрыхтоўкі кадраў для Беларускай кіно-фабрыкі «Савецкая Беларусь» з 1 лістапада адкрываецца Беларускае акторскае аддзяленьне пры ленінградзкім тэхнікуме сцэнічнага мастацтва.

▲ Пераходны сьцяг атрымала Гомельская футбольная каманда прафсаюзаў на Ўсебеларускім конкурсе футбольных каманд, выйграўшы на фінальнай гульні з Барысавам 3:2 у карысьць Гомелю.

▲ 24 кастрычніка ў сталым прадстаўніцтве БССР у Маскве адбыўся вечар успамінаў кіраўнікоў бальшавікоў аб Кастрычніцкай рэвалюцыі на Беларусі. Вечар адкрыў старшыня СНК БССР тав. Галадзед.

З дакладамі выступілі т. т. Кнорын і Алібэкаў. З успамінамі выступалі т.т. Пятроў, Рагадзінскі, Дзімітроў і інш.

▲ Вялікую падрыхтоўчую работу па правядзеньні III Усесаюзнага конкурсу спараных брыгад разгарнулі віцебскія паравозьнікі.

▲ Выстаўка на тэму «Нашы дасягненьні» рыхтуе да Кастрычніцкіх сьвят Беларускі Дзяржаўны Сацыяльна Гістарычны Музэй у Менску

▲ Абутковая-пачынальная майстэрня коля калгасьнікаў адкрывае Гомельскі гарпэфкуст. Работа ў майстэрні будзе паставлена так, каб калгасьнік здаўны раніцой абутак, увечары мог яго атрымаць.

Менская электрастанцыя павінна працаваць бесьперабойна

Пасьпяховае выкананьне прамфінплану ў вялікай меры залежыць ад работы электрастанцыі. У апошні час работа Менскай электрастанцыі праходзіць з вялікімі перабоямі.

З гутаркі дырэктара Эльводу тав. Цапкавятага відаць, што вінаваты тут Менскі гарсавет, які фактычна затармазіў разгорнутую работу электрастанцыі. Як відома, асноўная прычына перабояў у рабоце электрастанцыі —гэта тормаз падвозкі апалу ад чыгуначнай станцыі. Для ажыцьцяўлення гэтага, паводле прамфінплану Эльводу было ўнесена асыгнаваньне ў суме 250 тыс. руб. для пабудовы паліўнага складу, але гарсаветам яно было зусім выкрэслена з пляну.

Апрача гэтага, для павялічэньня магутнасьці станцыі праводзіцца пастаноўка пятага катла, мантыроўка якога вельмі затрымліваецца з-за таго, што пастаўшчык (Ленінградзкі завод імя Леніна) своечасова не дастаўляе патрэбных частак.

Толькі ў IV квартале пабудову паліўнага складу распачалі, але гарсавет асыгнаваў толькі 100 тыс. руб.

Патрэбна зараз-жа гарсавету аддаць больш увагі Менскай электрастанцыі, ліквідаваць зараз-жа недахопы з тым, каб поўнасьцю забясьпечыць бесьперабойную работу электрастанцыі.

Самончук А. М.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Выканаць задачы ускладзеныя пленумам ЦК на каапэрацыю

(Гутарка са старшынёй прэзыдыуму праўленьня Белкаапсаюзу тав. Хаскіным)

На запытаньне, якія меры прыняты прэзыдыумам Белкаапсаюзу па хутчэйшым ажыцьцяўленьні рашэньняў верасьнеўскага пленуму ЦК УсеКП(б), старшыня прэзыдыуму Белкаапсаюзу тав.Хаскін у гутарцы з супрацоўнікам Белта паведаміў наступнае:

Асноўная цэнтральная задача, якая зараз пастаўлена перад усёй сыстэмай спажкаапэрацыі, гэта — мабілізацыя ўсіх сіл на барацьбу за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне на справе рашэньняў пленуму. З гэтай мэтай 16-га кастрычніка, на пашыраным паседжаньні прэзыдыуму БКС з удзелам работнікаў месц, быў шырока абмеркаваны практычныя мерапрыемствы па бальшавіцкім ажыцьцяўленьні рашэньняў пленуму. Зараз па ўсёй БССР камандыраваны члены прэзыдыуму для правядзеньня куставых нарад каапэрацыйных работнікаў.

Неабходна з усёй рашучасьцю падкрэсьліць, што ў галіне разгортваньня калгаснага гандлю, самазагатовак, наладжваньня работы каапэрацыі пановаму, — пры ўсіх нашых дасягненьнях, мы яшчэ значна адстаем .Тут і да лёка нездавальняючае разгортваньне гандлёвай сеткі, факты замарожваньня таваразвароту, неўрэгуляваньне пытаньня самазагатовак, нездавальняючая якасьць нашага кіраўніцтва на мясцох і г.д. Нашы арганізацыі ў пасобных выпадках з прычыны дрэннай работы ня толькі арганізавана ня ўзьдзейнічаюць, а аб'ектыўна дэзарганізуюць рынак, часта няправільнай самазагатоўчай работай, няўменьнем арганізаваць сустрэчны паток прамта вараў шырокага ўжываньня ня робяць адпаведнага ўплыву ў бок зьніжэньня непамерна ўзросшых цэн на сельска - гаспадарчыя прадукты. Значыць, — перабудаваць сваю работу такім чынам, каб працаваць, як гэта патрабуе ад нас партыя—вось у чым задача кожнага работніка шматтысячнага апарату сыстэмы спажывецкай каапэрацыі.

Мы ставім перад сабой задачу на працягу IУ-га кварталу поўнасьцю выканаць прадугледжаны на 1932 г. плян пашырэньня гандлёвай сеткі па БССР.

За апошні час сыстэма спажкаапэрацыі БССР зусім паслабіла барацьбу за гэткую «дробязь», як знадворны выгляд магазыну, адпаведнае санітарнае ўтрыманьне яго, адносіны да спажыўца і інш. Дабіцца ўзорнай работы магазыну, дабіцца таго, каб магазын сапраўды ўвасобіў у сябе ідэі культурнага савецкага гандлю — зрабіць усёй сыстэмы, як у горадзе, так і на вёсцы.

Для лепшай работы міжраённых баз, Белкаапсаюз ставіць перад упаўнаважаным камітэту таварных фондаў пытаньне аб больш правільным разьмяшчэньні аптовых баз прамысловасьці і тавараправодзячай сыстэмы. Гэтым мы дасягаем таго, што канчаткова будуць зьнішчаны сустрэчныя перавозкі і паралелізм у рабоце.

СельСТ павінны поўнасьцю скарыстаць права папярэдняга адбору тавараў у міжраённых базах, а апошнія ў сваю чаргу павінны рашуча пакончыць з практыкай мэханічнага разьмеркаваньня тавараў, элемэнтамі пры мусовага асартымэнту. Базы павінны ўстанавіць шчыльную сувязь з саматужна - прамысловымі арцелямі і ўтыль - цэхамі для ўсямернай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў.

Зусім недапушчальны факты паслаблення ўвагі самазагатоўкам, факты дэмабілізацыйных, «утрымаўскіх» настрояў сельскай сеткі, што выклікана на апошні час павялічэньнем завозу плянуемых тавараў на вёску.

Побач з задачай поўнага выкананьня завозу плянуемых тавараў, хутка іх прасоўваньня да спажыўца,—задача сыстэмы максымальна разгарнуць самазагатоўкі, перайсьці ад слоў да дзелавых і правільных узаемаадносін з арцелямі прамкаапэрацыі і ўтыль-цэхамі.

Для ўрэгулявання справы самазагатовак, Белкаапсаюз зараз пераглядае ўсю сыстэму прымацаваньня ЗРК і іншых каапэратываў да загатоўчых пунктаў і самую сыстэму раёнаваньня пад кутом погляду адхіленьня шматлікіх загатоўчаў у адным і тым-жа пункце, што стварала ажыятаж і ўздуваньне цэн на загатоўчым рынку. Рабочыя каапэратывы будуць прымацаваны да загатоўчых пунктаў на пачатках працялых дагавароў з калгасамі. Максымальна будуць узмоцнены самазагатоўкі ў глыбінных пунктах. Таксама арганізуюцца прадпрыемствы па першапачатковай пераапрацоўцы сельска-гаспадарчых прадуктаў у глыбінках.

У ажыцьцяўленьні рашэньняў пленуму, Белкаапсаюз у бліжэйшыя дні заканчвае прапрацоўку канкрэтных мерапрыемстваў аб матарыяльнай базе каўленасьці загатоўчага апарату.

Задача аб'яднаньня БКС, ЗРК, ЦРК, райсаюзаў і іншых каапэрацыйных арганізацый — прыняць максымальны ўдзел у рабоце канэрэнцыйных бюро. Неабходна ўсямерна ўзьняць ролю гэтых бюро з тым, каб яны былі сапраўды органамі рэгуляваньня загатоўчых цэн на рынку.

Для поўнага выкананьня рашэньняў прэзыдыуму Цэнтрасаюзу і Белкаапсаюзу, аб зьніжэньні на працягу IУ-га кварталу адміністрацыйна - кіраўнічых выдаткаў ня менш, як на 20 процантаў, пры прэзыдыуме Белкаапсаюзу, а таксама пры кожным аб'яднаньні, райсаюзе, ЦРК і ЗРК арганізаваны сталыя дзейныя камісіі, якія шчырасьцю адказваюць за ажыцьцяўленьне гэтай важнейшай дырэктывы. Для ўзмацненьня низавых зьвеньняў каапэрацыі, Белкаапсаюз ставіць пытаньне

накіраваньні адпаведнай колькасьці работнікаў з цэнтральнага апарату ў низавыя зьвеньні. Камісія пры прэзыдыуме Белкаапсаюзу ўжо закончыла сваю работу, у выніку чаго цэнтральны апарат Белкаапсаюзу скарочаны на 104 асобы. Частка скарочаных работнікаў будзе перакінута ў низавыя зьвеньні, галоўным чынам у сельскую каапэрацыю. Ужо скарочаны адміністрацыйна - кіраўнічыя выдаткі 4-га кварталу ў параўнаньні з III кварталам на суму звыш 200 тысяч руб.

Звязаны групу цэн і выдаткаў звароту на працягу 2-х дэкад забясьпечыць зьніжэньне выдаткаў звароту да норм, якія ўстаноўлены прэзыдыумам Белкаапсаюзу.

Шматлікія кадры сыстэмы спажкаапэрацыі даюць вялікую магчымасьць у справе лепшай расстаноўкі сіл, лепшага скарыстаньня наяўных кадраў. Пытаньні кадраў у сыстэме спажкаапэрацыі мы абавязаны штодня займацца. Мы павінны рашуча пакончыць з недапушчальнай цякучасьцю, якая наглядаецца ў радох каапэрацыйнага апарату. Белкаапсаюз зьвярнуўся ў адпаведныя дырэктыўныя органы з просьбай вынесьці рашэньне аб недапушчальнасьці зьняцьця старшынь сельСТ, лесарабкопаў і торфарабкопаў, якія апраўдалі сябе на рабоце ня ведама пайнікаў і бяз санкцыі Белкаапсаюзу, а таксама аб забароне зьнімаць і перакідваць на іншую работу работнікаў райсаюзаў, як-та: інструктароў, загадчыкаў райзагаў, арг-аддзелаў, загадчыкаў гандлёвымі аддзеламі і рахункових работнікаў спажкаапэрацыі. Але ўсё гэта ні ў якай меры ня зьнімае адказнасьці з кожнай каапэрацыйнай арганізацыі, якая павінна аддаць максымальную ўвагу справе падрыхтоўкі ўласных кадраў, справе правільнай расстаноўкі наяўных сіл. Неабходна на працягу месяца дабіцца ўкамплектаваньня і ўмацаваньня работнікамі арганізацыйна - масавых апаратаў сыстэмы спажкаапэрацыі (інструктары, загадчыкі, арг аддзеламі, рэвізоры і г. д.).

У надыходзячай спрэ-кампаніі задача - перавыбарчай кампаніі неабходна самым шырокім чынам завастрыць пытаньне па забясьпечаньні поўнай выбарнасьці ва ўсёй сыстэме спажкаапэрацыі і на максымальнае ўмацаваньне сувязі каапэрацыйных арганізацый з шырокімі масамі пайнікаў. Пры шырокай дапамозе пайнікаў трэба разгарнуць бязьлітасную барацьбу з расхраданьнем каапэрацыйнай маемасьці. Неабходна ўкараніць у работу кожнага каапэраты